
КАМУ ЎДАЕЦЦА ЗРАБІЦЬ СКЛАДАНАЕ ПРОСТЫМ? 5

ГАЛОЎНЫЯ РОЛІ І ПЕРАКАНАННІ РУСЛАНА ЧАРНЕЦКАГА 12


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 КАСТРЫЧНІКА 2022 г. СУБОТА № 193 (29815)

## ДУХОЎНЫ ПАЧАТАК АСВЕТЫ

*Педагагічным работнікам Рэспублікі Беларусь*

***Паважаныя работнікі сферы адукацыі!***

***Дарагія сябры!***

***Віншую вас з Днём настаўніка.***

***На працягу шматвяковай гісторыі беларускага народа настаўніцтва з'яўляецца адной з самых высакародных і старавальных прафесій падобна падзвіжніцтву. Духоўны пачатак, асвета, шанаванне вучоных людзей былі пакладзены нашымі продкамі ў аснову айчыннай адукацыі і выхавання, сталі сапраўдным здабыткам краіны.***

***Захоўваючы перамемнасць і адданасць сваёй справе, любоў да дзяцей і вернасць роднай зямлі, вы ствараеце будучыню Беларусі, якая складаецца з дасягненняў вашых выхаванцаў.***

***Перакананы, што разам з вамі мы прымножым усё найлепшае ў нацыянальнай сістэме адукацыі, а гордае званне настаўнік, падмацаванае вашымі талентамі, педагагічнай мудрасцю і прафесійным вопытам, будзе заўсёды карыстацца найвышэйшым аўтарытэтам, глыбокай павагай і вялікай любоўю мільёнаў беларускіх дзяцей і іх бацькоў.***

***У гэты святочны дзень жадаю вам і вашым блізкім моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту!***

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## НАША ПАДЗЯКА ЗАХАВАЛЬНІКАМ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ І ПРАЎДЫ

***Дарагія сябры!***

***Прыміце самыя шчырыя віншаванні з Днём пажылых людзей.***

***Гэтае свята — сімвал адзінства і пераемнасці пакаленняў. Яркае сведчанне бязмежнай павагі да тых, хто з'яўляецца захавальнікам гістарычнай памяці і праўды, маральных асноў і багатых традыцый беларускага народа.***

***Аддаўшы шмат гадоў стварэнню Беларусі, выгадаваўшы дзяцей і ўнукаў, вы і сёння працягваеце ўносіць вялікі ўклад у развіццё краіны, шчодра дзеліцеся з моладдзю ведамі і жыццёвай мудрасцю, асабістым прыкладам выхоўваеце сапраўдных працаўнікоў і патрыётаў.***

***Вы заўсёды можаце разлічваць на ўсебаковую сацыяльную абарону і падтрымку. Павышэнне якасці жыцця, стварэнне ўмоў для актыўнага і дастойнага даўгалецця нязменна будуць найважнейшымі прыярытэтамі нашай дзяржаўнай палітыкі.***

***Жадаю вам мірнага неба над галавой, невычэрпнага аптымізму, душэўнага цяпла ад зносін з роднымі і блізкімі. Будзьце здаровыя і шчаслівыя.***

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй МАЦЕЛЬСКІ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі:**

*«Інфармацыйныя тэхналогіі незаўважна, але глабальна змянілі наш свет. Іх развіццё адбываецца імкліва. Укараненне тэхналогій мяняе падыходы да працы. Напрыклад, развіццё тэхналогій вядзення нацыянальнага рэестра і афіцыйнага апублікавання прававых актаў стала лакаматывам працэсу лічбавізацыі нарматворчай дзейнасці, дазволіла забяспечыць даступнасць прававых актаў для грамадскага абмеркавання грамадзянамі нашай краіны, выступіла асновай фарміравання банка даных лакальных прававых актаў для дзяржаўных органаў і арганізацый».*

# ЗАЛАТЫЯ ГАДЫ, ЗАЛАТОЕ ВЯСЕЛЛЕ



**У Салігорску прайшла ўрачыстая рэгістрацыя 50-годдзя сумеснага жыцця сямейных пар. Сярод іх былі сужэнцы Леанід і Валянціна НАРКО.**

Фота БелТА.

**Се СЯАЮН:** Эксклюзіў

# «КІТАЙСКА-БЕЛАРУСКАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА ПОЙДЗЕ ПА ПАСКОРАНЫМ ШЛЯХУ РАЗВІЦЦЯ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпін дамовіліся аб гістарычным уздыме супрацоўніцтва на новы ўзровень. Пра гэта стала вядома падчас сустрэч лідараў двух краін у Самаркандзе. «За 30 гадоў дыпламатычных адносін Кітая і Беларусі нашы двухбаковыя адносіны бесперапынна павышаюцца, — адзначыў Сі Цзіньпін. — Сумесна са спадаром Прэзідэнтам дасягнутыя дамоўленасці эфектыўна рэалізоўваюцца, усебаковае супрацоўніцтва двух краін адрозніваецца трываласцю і ўстойлівасцю».**

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў кітайскаму калегу за тое, што ў няпросты час — пандэмію і нестабільнасць у свеце — бакі знайшлі ў сабе сілы і рашучасць для таго, каб вывесці адносіны на новы ўзровень усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства. «На вельмі прыстойны і дастойны ўзровень. І мы зробім усё для таго, каб вы не пашкадавалі аб гэтым і не памыліліся ў сваім выбары», — запэўніў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Як развіваецца беларуска-кітайскае супрацоўніцтва, чаго ўдалося дасягнуць і што намечана зрабіць сумеснымі намаганнямі дзвюх краін, у эксклюзіўным інтэрв'ю «Звяздзе» распавёў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі Се СЯАЮН.**



***— Спадар пасол, многія ключавыя аспекты нашага супрацоўніцтва абмяркоўваюцца на ўзроўні найвышэйшага кіраўніцтва двух дзяржаў. Гэта, безумоўна, надае магутны імпульс узаемадзеянню, яго паглыбленню і пашырэнню. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Старшыня КНР Сі Цзіньпін нядаўна сустрэліся ў Самаркандзе і дамовіліся аб гістарычным уздыме двухбаковых адносін на новы ўзровень. Што гэта значыць для нашых краін?***

— 15 верасня Старшыня Сі Цзіньпін і Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сустрэліся на палях 22-га пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ў Самаркандзе і сумесна аб'явілі аб вывядзенні двухбаковых адносін на ўзровень усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X
22193

З першых вуснаў

# «МЫ ЗАЎСЁДЫ АДДАНЫЯ МІРНАМУ ВЫРАШЭННЮ ЛЮБЫХ МІЖНАРОДНЫХ ПРАБЛЕМ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў даверчыя граматы ад паслоў 11 краін. Урачыстая цырымонія прайшла ў Палацы Незалежнасці. Даверчыя граматы беларускаму лідару ўручылі паслы Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, Аргенціны, Беніна, Босніі і Герцагавіны, Бразіліі, Кубы, Ордэна Мальты, М'янмы, Палясціны, Судана і Швейцарыі.**

Вітаючы паслоў, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта важная цырымонія азначае пачатак іх паўнапраўнай дзейнасці на адказнай пасадзе кіраўніка дыпламатычнай місіі ў Беларусі. «Я ўпэўнены, што ўсе вы шчыра паважаеце беларускі народ, а таксама яго выбар, каб канструктыўна працаваць з першых дзён свайго знаходжання на нашай зямлі. Ведайце, Беларусь заўсёды адкрытая для любых разумных ініцыятыў. Перакананы: у кантактах з прадстаўнікамі нашых дзяржаўных органаў, бізнесу і грамадскіх арганізацый вы ўбачыце выключна добразычлівы і дзелавы падыход», — падкрэсліў ён.

## «Мы рабілі ўсё, каб спыніць кровапраліцце»

Кіраўнік дзяржавы пачаў з абмеркавання актуальных пытанняў. Ён заўважыў, што дыпламатычная місія паслоў пачынаецца ў знакавы для беларусаў перыяд. Зусім нядаўна, 17 верасня, Беларусь адзначыла самае маладое дзяржаўнае свята — Дзень народнага адзінства. Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што з часу аб'яднання, як і раней у сваёй гісторыі, беларусы ні на каго не нападалі. Ні для каго не былі крыніцай пагрозы. Так будзе і надалей.

«Падкрэсліваю, менавіта так будзе і надалей. Мы заўсёды адданыя мірнаму вырашэнню любых міжнародных праблем. Страціўшы кожнага трэцяга ў часы фашысцкага генацыду, беларусы, як ні адна іншая нацыя ў свеце, высока шануюць чалавечае жыццё. Кожнае», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, менавіта з гэтай прычыны і раней, і сёння, калі побач, ва Украіне, палае ваенны канфлікт, беларусы нязменна выступалі і выступаюць з мірнымі ініцыятывамі на міжнароднай арэне. «Мы лічым канфлікт паміж брацкімі народамі вялізнай трагедыяй. Ён — прамое наступства стратэгічных інтрыг і найвялікшай дурасці заходніх палітыкаў», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што сёння многія гавораць аб гэтым канфлікце. І вельмі многія заяўляюць, што хацелі б міру на гэтай зямлі. Асабліва еўрапейцы, бо гэты канфлікт у нашым еўрапейскім доме.

«Калі еўрапейцы шчыра гэтага жадаюць, міру можна дасягнуць на працягу некалькіх дзён. Каторы раз заяўляю пра гэта і папярэджваю еўрапейцаў: адумайцеся і рабіце ўсё для таго, каб на гэтай зямлі быў мір», — сказаў Прэзідэнт. Па словах кіраўніка дзяржавы, Беларусь шчыра спрабавала ўсімі сіламі не дапусціць гэтага вар'яцтва.

«І не трэба нас папракаць у суагрэсіі ці яшчэ ў нечым. Мы былі, ёсць і будзем разам з нашай Расіяй. У нас з Расіяй саюз больш сумленны, чым у блоку НАТА. Але ў той жа час мы кажам, што не будзем ваяваць на Украіне. Давайце мірна супрацоўнічаць. Беларусь украінцам няма ў чым папракнуць. Нас, беларусаў, няма ў чым папракнуць. Не мы пачалі канфліктаваць з Украінай. Гэта яны раней за заходнія дзяржавы і Амерыку закрылі неба для пралёту нашых самалётаў і аб'явілі эканамічную блакаду Беларусі. Чаго вы зараз парыцеся і ад нас чагосьці патрабуеце? Мы свята выконваем свае дамоўленасці з Расіяй. І аб гэтым да канфлікту ведалі ўсе ў НАТА і асабліва ў Амерыцы. Мы нікога не забівалі і забіваць не збіраемся. Мы былі прыхільнікамі мірных перагавораў», — сказаў Прэзідэнт. Ён нагадаў пра тры раўнды перагавораў, якія адбыліся ў Беларусі. Аляксандр Лукашэнка назваў рытарычным пытанне, чаму іх згарнулі. Прэзідэнт падкрэсліў, што кажа ўсё гэта паслам, каб яны ведалі беларускую пазіцыю па самай вострай сучаснай праблеме і выходзілі з гэтага.

«Мы рабілі ўсё, каб спыніць кровапраліцце. Але гэтае кровапраліцце камусьці трэба. Каму? Вы дыпламаты, разбірайцеся», — сказаў ён.

## «Адчыняйце дзверы — павязём вам харчаванне»

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сёння часта чуюцца заявы палітыкаў аб іншай вельмі вострай праблеме ў свеце — харчовым крызісе. Ён падкрэсліў, што па кошце збожжа ўжо становіцца золатам. І далёка не ўсе могуць яго набыць. «Прычым мільярды долараў на зброю знаходзяць лёгка, а на тое, каб выратаваць ад голаду мільёны людзей, перш за ўсё старых і дзяцей у самых бедных краінах, грошай няма і не прадбачыцца. Некаму зноў трэба разагрэць сур'ёзны канфлікт. А можа быць, распрацавалі аперацыю прыкрыцця таго, што некаторыя «сільныя міра сего» робяць у свеце. На Балтыцы ўзарвалі газаправод, хутка пачнецца эпапея абвінавачання Расіі, што Расія ўзарвала свой газаправод, каб не пастаўляць газ Еўропе (маецца на ўвазе дыверсія на ветках газаправода "Паўночны паток". — **Зв.**). Калі Еўропа пачне замярзаць, пачнуць там людзям казаць, што гэта Расія вінавата», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт нагадаў, што Беларусь не толькі забяспечвае сваю харчовую бяспеку, але і можа выступаць яе донарам. Беларускі бок гатовы аднавіць супрацоўніцтва ў гэтай жыццёва важнай сферы, асабліва па пастаўках не толькі харчавання, але і калійных угнаенняў, без якіх харчавання не бывае. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, для гэтага патрэбна толькі палітычная воля кіруючых колаў Захаду. Кіраўнік дзяржавы расказаў, што доўга абмяркоўваў гэту праблему на нядаўняй сустрэчы са сваім расійскім калегам Уладзімірам Пуціным.

«У Беларусі і ў Расіі сёлета небывалы ўраджай. І, як мне сказаў Прэзідэнт Пуцін, яны гатовы вялікую масу збожжа, і пшаніцы перш за ўсё, паставіць на міжнародны рынак. Адкрывайце парты, адчыняйце дзверы — павязём вам харчаванне і збожжа», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што нават ва ўмовах беспрэцэдэнтнага санкцыйнага ціску Беларусь паспяхова развіваецца. Асабліва гэта датычыцца традыцыйных для нас галін прамысловасці і сельскай гаспадаркі. «Мы здолелі пераарыентаваць экспарт, займаемся імпартазамяшчэннем, павялічылі пастаўкі ў Расію, Кітай і краіны «далёкай дугі». Канешне, мы адчуваем негатыўны эфект ад заходніх абмежаванняў з прычыны адкрытасці нашай эканомікі. Тым не менш сваіх мэт санкцыі не дасягнулі. У тым ліку і дзякуючы шырокай міжнароднай падтрымцы Беларусі», — расказаў ён.

## «Мы гатовы разгледзець любы пункт гледжання»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што гэты год у Беларусі праходзіць пад знакам захавання гістарычнай памяці нашага народа. «Беларускі народ вельмі шчыры, добразычлівы і працавіты. Вы даведаецеся, наколькі багатая наша зямля, як шмат сфер для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва мы з вамі можам паспяхова развіваць», — звярнуўся ён да паслоў. Прэзідэнт прапанаваў дыпламатам праяўляць актыўнасць ва ўмацаванні двухбаковага ўзаемадзеяння паміж нашымі дзяржавамі. «Мы заўсёды пойдзем насустрач вашым канструктыўным ідэям, праектам і прапановам. Мы гатовыя разгледзець любы пункт гледжання», — сказаў ён. Беларускі лідар пажадаў паслам поспехаў у дыпламатычнай дзейнасці на карысць нашых народаў!

### У тэму

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў у Рэспубліцы Беларусь Ібрагім Салім Махамед Аль-Мушарах:**

— Беларусь — гэта краіна, якая здзіўляе мяне кожны дзень і кожны раз у прыемным плане. Нам трэба размаўляць адзін з адным, весці перагаворы і асаблівую ўвагу звяртаць на аб'екты, якія ўяўляюць узаемную цікавасць для абедзвюх дзяржаў: гэта і палітычная сфера, і эканамічная, і сацыяльная, і культурная. Перш за ўсё, трэба ствараць магчымасці для інвестыцый. У нас ужо ёсць некалькі буйных праектаў. Самы вядомы з іх — «Паўночны бераг». Спадзяюся, што будзе яшчэ больш такіх праектаў.

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Куба ў Рэспубліцы Беларусь Санцьяга Перэс Бенітэс:**

— Беларусь і Куба павінны разам працаваць для выхаду на новую ступень у адносінах і дапамагаць адзін аднаму, як заўсёды дапамагалі. Беларусь дапамагала Кубе за ўсе гады незалежнасці, выступала супраць блакады Кубы. Мы, у сваю чаргу, супраць нелегальных санкцый у адносінах да Беларусі, супраць умяшальніцтва ва ўнутраныя справы брацкай краіны. Мы зараз знаходзімся ў якасна новым этапе нашых адносін. Цяпер патрэбна шукаць і знайсці канкрэтныя нішы, каб уся наша палітычная воля трансфармавалася ў якасна новы этап у нашых эканамічных адносінах. Праблемы ёсць, але яны пераадольныя, бо ёсць воля і братэрскія пачуцці.

# «ГАЛОЎНАЕ — ПРАЦАВАЦЬ ПА ПРАВІЛАХ БАНКАЎСКАЙ СФЕРЫ І ПА ЗАКОНАХ НАШАЙ КРАІНЫ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу са старшынёй дзяржаўнай карпарацыі развіцця «ВЭБ.РФ» Ігарам Шувалавым.**

Вітаючы госця ў Палацы Незалежнасці, кіраўнік дзяржавы заўважыў, што Ігар Шувалаў — не толькі наш даўні партнёр, як прынята казаць у Расіі, і сябар, як кажуць у Беларусі, а і кіраўнік буйнога расійскага, міжнароднага банка. «Банк актыўна развіваецца, нягледзячы на ўсе тыя праблемы, якія ствараюць нашы партнёры па той бок, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Што датычыцца беларуска-расійскага супрацоўніцтва, вы прымаеце ўдзел у фінансаванні нашых прадпрыемстваў, інвестыцыйных праектаў, перш за ўсё БелАЭС».

Пры гэтым Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што банк можа ўдзяльнічаць у рэалізацыі намечаных беларускім бокам праектаў, у тым ліку па імпартазамяшчэнні. І на гэты конт ужо ёсць пэўныя дамоўленасці. «Мы вітаем ваш больш актыўны ўдзел у рабоце ў Беларусі, будзем усяляк падтрымліваць», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Патрэбная дапамога, у прыватнасці, будзе аказана ў адкрыцці прадстаўніцтва расійскага банка ў Беларусі. Галоўнае патрабаванне Прэзідэнта — каб працавалі па правілах, вызначаных банкаўскай сферай, а таксама па законах нашай краіны. Пры гэтым беларускі лідар заўважыў, што банкіры ў гэтым плане вельмі акуратныя, законы не парушаюць. І яшчэ адна ўмова Аляксандра Лукашэнкі ў гэтым кантэксце — каб банк, асабліва «БелВЭБ» (дачэрні банк «ВЭБ.РФ». — **«Зв.»**), быў сапраўдным беларускім банкам.

У сваю чаргу, Ігар Шувалаў прапанаваў Прэзідэнту абнаўлены парадак дня расійска-беларускага супрацоўніцтва ў межах Саюзнай дзяржавы, якая датычыцца сумесных экспартных праектаў. «З аднаго боку, мы сапраўды перажылі пасля 24 лютага мноства санкцый: да некаторых адаптаваліся, некаторыя ўзнікнуць у будучыні, — адзначыў Ігар Шувалаў. — Беспрэцэдэнтны санкцыйны ціск аказаны і на Беларусь, і на Расію, але тым больш моцнымі павінны быць нашы кааперацыя і сяброўства».

Старшыня дзяржаўнай карпарацыі развіцця «ВЭБ.РФ» папрасіў у беларускага лідара падтрымкі па пэўных праектах, якія будуць развівацца ў першую чаргу «БелВЭБ». «У цэлым, гэта прывядзе да пабудовы тэхналагічнага суверэнітэту, або, як правільна заўважыў Прэзідэнт, новых тэхналагічных прадпрыемстваў па імпартазамяшчэнні, стварэнні больш моцнай эканомікі і ў Беларусі, і ў Расіі, — звярнуў увагу Ігар Шувалаў. — У нас вялікія перспектывы працаваць сумесна на рынках трэціх дзяржаў».

**Вераніка КАНЮТА, Валерыя СЦЯЦКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Крамлі падпісалі дагаворы аб уступленні новых тэрыторый у склад Расіі




Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін падпісаў пагадненні аб прыняцці ў склад краіны Данецкай і Луганскай народных рэспублік, а таксама Херсонскай і Запарожскай абласцей, паведаміла РІА «Навіны». Цырымонія прайшла ў Георгіеўскай зале Крамля. Удзел прынялі кіраўнікі Данецкай і Луганскай народных рэспублік Дзяніс Пушылін і Леанід Пасечнік, а таксама кіраўнікі Херсонскай і Запарожскай абласцей Уладзімір Сальда і Яўген Баліцкі. Уладзімір Пуцін падпісаў дагаворы аб далучэнні ўсіх чатырох рэгіёнаў і ўтварэнні новых суб'ектаў у складзе Расіі. З 23 да 27 верасня ў ДНР і ЛНР, а таксама ў Херсонскай і Запарожскай абласцях адбыліся рэферэндумы аб уваходжанні гэтых рэгіёнаў у склад Расіі. Паводле абвешчаных вынікаў, гэтае рашэнне падтрымалі 87,05 % — у Херсонскай вобласці, 93,11 % — у Запарожскай вобласці, 99,23 % — у ДНР, 98,42 % — у ЛНР. Адразу ж пасля правядзення рэферэндумаў усе чатыры тэрыторыі звярнуліся да расійскага боку з просьбай аб уключэнні іх у склад РФ.

## У выніку выбуху ў Кабуле загінула звыш 30 чалавек

Не менш чым 32 чалавекі загінула пры выбуху ў афганскай сталіцы. Пра гэта паведаміў тэлеканал Al Jazeera са спасылкай на мясцовыя ўлады. Яшчэ 40 чалавек пацярпелі ў выніку здарэння. Вядома, што выбух прагрымеў у навучальным цэнтры Kaaj learning center у раёне Дашце Барчы на захадзе Кабула. Уім знаходзілася да 400 навучэнцаў, якія здавалі экзамены. Паводле папярэдняй інфармацыі, выбух быў учынены тэрарыстам-смяротнікам. Зламыснік пракраўся ў адукацыйную ўстанову і стрэліў у ахоўніка. Пасля ён уварваўся ў клас, дзе знаходзіліся вучні, і прывёў у дзеянне выбуховае прыстасаванне. «Рашуча асуджаем напады на грамадзянскія аб'екты, якія даказваюць жорсткасць саперніка», — адзначыў начальнік прэс-цэнтра паліцыі Кабула Халід Задран. Афіцыйны прадстаўнік руху «Талібан» Забіула Муджахід заявіў, што ўлады Афганістана знойдуць і пакараюць вінаватых у здзяйсненні тэракта.

## Каралева Даніі пазбавіла чатырох унукаў тытулаў прынца і прынцэсы

Малодшы сын каралевы Даніі Маргрэтэ II прынц Ёакім шкадуе аб рашэнні маці вызваліць яго дзяцей ад тытулаў прынцаў і прынцэсы, паведаміла брытанская газета Daily Mail. Пра гэты крок прынц даведаўся толькі "за пяць дзён" да яго абнародавання. Сваё рашэнне каралева матывавала тым, што хацела б дазволіць унукам і ўнучцы «весці жыццё без абмежаванняў, звязаных з асаблівымі меркаваннямі і абавязкамі, якія цягне за сабой фармальная прыналежнасць да каралеўскага дома Даніі». Пры гэтым рашэнне Маргрэтэ II не распаўсюджваецца на дзяцей яе старэйшага сына, наследнага прынца Фрыдэрыка, удакладняе выданне. Паводле інфармацыі газеты, у прынца Ёакіма чацвёра дзяцей. Старэйшыя браты Мікалай і Фелікс будуць кар'еру ў мадэльным бізнесе, малодшыя, Хенрык і Афіна, яшчэ не дасягнулі паўналецця. Маргрэтэ II уступіла на трон 14 студзеня 1972 года, калі памёр яе бацька — кароль Фрыдэрык IX. Пасля смерці брытанскай каралевы Лізаветы II 82-гадовая дацкая каралева стала самым даўгавечным з кіруючых манархаў.

На кантролі

# ЦЭНЫ — «ЯК У АПТЭЦЫ»

**На Гомельшчыне парламентарыі працягваюць аналіз цэн харчовых, прамысловых тавараў першай неабходнасці і медыцынскіх прэпаратаў. Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Ірына ДАЎГАЛА правяла маніторынг кошту, наяўнасці і асартыменту медтавараў у аб'ектах аптэчнай сеткі дзяржаўнай і прыватнай формаў уласнасці Гомеля.**



Для правядзення маніторынгу былі абраныя аптэкі ў Савецкім раёне абласнога цэнтра. У іх абслугоўваецца значная колькасць пажылых, людзей з інваліднасцю, шматдзетныя сем'і і іншыя ўразлівыя катэгорыі грамадзян. У непасрэднай блізкасці — дарослая і дзіцячая паліклінікі, таму са спісам ад урача многія накіроўваюцца менавіта сюды, кажуць правізары аптэк. Скаргаў на павышэнне цэн на лекі апошнім часам супрацоўнікам не паступала.

— Наадварот, людзі задаволеныя, бо многія лекі значна патаннелі, — падчас маніторынгу настрой наведвальнікаў перадалі парламентарыю супрацоўнікі дзяржаўнай аптэкі «Фармацыя» № 165 па вуліцы Быхаўскай.

Тут для пакупнікоў арганізавана электронная чарга, для зручнасці пажылых людзей, інвалідаў, пакупнікоў з дзецьмі ўладкаваныя месцы адпачынку. У аптэцы не толькі лекавыя сродкі, але і прылады медыцынскай тэхнікі — у асартыменце.

— Штомесяц прыходжу сюды. Купляю прапісаныя лекі за 10 % ад кошту, бо ў мяне група інваліднасці, — падзялілася пастаянная наведвальніца гэтай аптэкі Лідзія Кузьмінічна Крывашэева. — Цяпер вось аддала за ўсе лекі 12 рублёў, а так бы — 120. Таму я вельмі задаволеная. Толькі словы падзякі.

Маніторынг кошту тавараў аптэчнай сеткі разам з аналізам цэн на харчовыя і прамысловыя тавары першай неабходнасці — сталая, сістэмная работа, звярнула ўвагу Ірына Даўгала.

— Гэта звязана з тым, што неабходна не проста кантраляваць даступнасць і асартымент сацыяльна значных тавараў, але і аналізаваць сістэму цэнаўтварэння на іх, — растлумачыла яна.

Парламентарый дадала, што да яе скаргаў ад жыхароў Гомеля на неабгрунтаваны рост цэн на лекі не паступала. Але аналіз цэн у аптэках як дзяржаўнай, так і прыватнай формаў уласнасці застаецца актуальным і важным пытаннем.

— Сёння нельга не казаць аб тым, што рост цэн у цэлым адбіваецца на настроі людзей. Але калі выконваецца баланс росту кошту і адпаведнага росту, у першую чаргу, пенсіі, сацыяльных дапамог і гэтак далей, то і ў людзей ёсць разуменне і адэкватная ацэнка дзяржаўнай палітыкі. І гэта вельмі важна, таму што мы працуем для людзей і ў імя людзей, — падкрэсліла дэпутат. — Зразумела, жыццё не стаіць на месцы і эканамічныя працэсы дыктуюць свае законы, але рост кошту, вядома, павінен быць абгрунтаваным, паступовым, каб рост заработнай платы, пенсіённага забеспячэння, усіх сацыяльных выплат і дапамог суадносіўся з ростам цэн. Для гэтага і праводзім маніторынгі. Не трэба нажывацца на горы і праблемах людзей, гэта не прынясе ніводнаму суб'екту гаспадарання ні матэрыяльнага, ні маральнага задавальнення.

Увогуле, у аптэчнай сетцы Гомельшчыны рэалізоўваецца каля 8 тысяч найменняў тавараў, звярнула ўвагу **генеральны дырэктар Гомельскага РУП «Фармацыя» Людміла САПЕГА,** якая далучылася да парламентарыя падчас маніторынгу. Яна падкрэсліла, што цэны на медпрэпараты і ў дзяржаўных, і ў прыватных аптэчных сетках — строга пад кантролем заканадаўства. Разам з тым, сёння ў аптэках назіраюцца выпадкі, калі істотна адрозніваецца цана на ідэнтычныя пазіцыі прэпаратаў.

— Вядома, мы прааналізавалі сітуацыю, — зрабіла акцэнт Ірына Даўгала. — Гэта ў першую чаргу звязана з тэрмінамі закупкі прэпаратаў. Часцей за ўсё гэта датычыцца імпартных тавараў, якія былі закуплены на піку курсавых ваганняў. Напрыклад, у пачатку года закупка ішла па дастаткова высокім курсавым эквіваленце. Лекі паступілі ў рэалізацыю і іх рэшткі прадаюцца па ранейшай цане, а новае паступленне можа быць таннейшым. Такія моманты мы тлумачым.

Кіраўнік Гомельскага РУП «Фармацыя», у сваю чаргу, адзначыла, што сёння ў аптэках спыненыя пастаўкі пэўных лекавых сродкаў. Найперш гэта прэпараты, якія паступалі з Украіны.

— Але ў той жа час, цяпер дадзенае пытанне вырашаецца вытворцамі з таго боку і пастаўкі ідуць праз іншыя краіны. Акрамя таго, пэўныя прэпараты замяняюцца аналагічнымі найменнямі іншых вытворцаў, — запэўніла Людміла Сапега.

Праводзіцца сур'ёзная работа, у тым ліку ў рамках Саюзнай дзяржавы, па замене прэпаратаў і іх складнікаў імпартнай вытворчасці, заўважыла Ірына Даўгала. І гэта таксама ўплывае на цэнаўтварэнне, паколькі мяняюцца і выдаткі на лагістыку. Дэпутат падкрэсліла, што па выніках маніторынгу кошту, наяўнасці і асартыменту медтавараў у абраных аптэках дзяржаўнай і прыватнай формаў уласнасці заўваг няма. На кантролі застаецца забяспечанасць аптэк супрацьвіруснымі прэпаратамі, лекамі для лячэння хранічных захворванняў, а таксама сродкамі дэзынфекцыі.

Дарэчы, дэпутат ніжняй палаты парламента падзялілася, што падчас прыёмаў грамадзян ёй даводзіцца закранаць пытанне прафілактыкі захворванняў, вядзення здаровага спосабу жыцця.

— Сёння ў нас створана проста каласальная інфраструктура спартыўных і фізкультурных аб'ектаў. Прыходзьце самі, са сваімі сем'ямі, рухайцеся, займайцеся дыхальнай гімнастыкай, імкніцеся бачыць пазітыўнае, бо гэта ў тым ліку ўплывае на фізічны стан кожнага чалавека, — заклікала парламентарый.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

Добры старт

# ІДЗІЦЕ НА ЗДАРОЎЕ!

## Марафон па скандынаўскай хадзьбе для пенсіянераў прайшоў у Гомелі

**«З чаго пачаць? З таго, што не звяртаць увагі на каментарыі бабуль на лавачцы пад пад'ездам...» У свае 81 менавіта такі лайфхак пераадолення і палычування сябе да актыўнага руху і заняткаў скандынаўскай хадзьбой агучвае гамяльчанка Вольга КАВАЛЁВА. Яна стала самым узроставым удзельнікам унікальнага для абласнога цэнтра марафону па скандынаўскай хадзьбе для людзей сталага ўзросту.**



— Я заўсёды была спартыўнай. Майму праўнуку — восем. З нараджэння дапамагала глядзець яго: ён бегае на дзіцячай пляцоўцы, я за ім, — смяецца 81-гадовая ўдзельніца марафону. — А наогул я стала рабіць зарадку і хадзіць, калі пачалі ногі «адмаўляць». Зразумела, што калі зараз сяду, то больш не падымуся, — дзеліцца Вольга Мікалаеўна.

Марафон па скандынаўскай хадзьбе ў Гомелі арганізавалі на цэнтральнай набярэжнай Сожа. Для спартыўнага пешага пераадолення вызначылі дыстанцыю ў два з паловай кіламетра. Усяго на старт выйшлі без малога тры дзясяткі актыўных дэядуляў, бабуль і прабабуль. Самаму маладому марафонцу — 66 гадоў.



— Вельмі шмат сённяшніх удзельнікаў пачыналі займацца скандынаўскай хадзьбой адныімі з першых у Гомелі яшчэ ў 2015 годзе, — патлумачыла **інструктар Алена СНЯЖКО**, якая правяла абавязковую размінку перад пачаткам марафону.

Усе яго ўдзельнікі пасля праходжання дыстанцыі атрымалі ганаровыя дыпломы. Падчас падвядзення вынікаў спаборніцтва былі вызначаны і ўладальнікі залатога, сярэбранага і бронзавага медалёў.

— Мая парада ўсім — менш заседжвацца перад камп'ютарам. Жыццё вакол нас такое разнастайнае, столькі шмат цікавага ў ім, а скандынаўская хадзьба — задавальненне і фізічнае, і духоўнае. Пачынаеш заўважаць, як свет вакол цябе мяняецца, як мяняюцца людзі, што побач, — падзялілася **прызёр марафону, адна з самых актыўных удзельніц усіх культурна-спартыўных мерапрыемстваў у Чыгуначным раёне Гомеля Элеанора МАКСІМАВА.**

Рэспубліканскі марафон скандынаўскай хадзьбы «Узрост — гэта не бяда, гэта найлепшыя гады!» адначасова прайшоў у розных гарадах Беларусі. У Гомелі падобнае спартыўнае свята абавязкова павінна стаць добрай традыцыяй, заклікаў марафонцаў залатога ўзросту **начальнік аддзела спорту і турызму Гомельскага гарвыканкама Ігар ПАЛУЯН.**

— У падарунак усе ўдзельнікі атрымалі турыстычныя даведнікі аб Гомелі з картай маршруту, дзе можна і ў сваё задавальненне займацца скандынаўскай хадзьбой або любым любімым відам спорту і сузіраць славутасці горада, — дадаў ён.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

Сезон

# СЁННЯ — ПАЧАТАК ТРАДЫЦЫЙНЫХ ПАЛЯВАННЯЎ

**Згодна з Правіламі палявання, з 1 кастрычніка стартуе адно з самых папулярных у Беларусі паляванняў — загоннае паляванне на капытных паляўнічых жывёл, якое працягнецца да 31 снежня.**



Фота з сайта Дзяржінспекцыі.

Як падкрэслілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету, характэрна, што ў бягучым годзе адкрыццё загоннага палявання на капытных супадае з пачаткам асенне-зімовага сезона палявання на пушных паляўнічых жывёл (з першай суботы кастрычніка), які традыцыйна пачынаецца з адкрыцця палявання на зайца-русака і зайца-беляка з дыпламаванымі ганчакамі.

З 5 лістапада пералік дазволеных да здабычы пушных паляўнічых жывёл дапоўніцца вавёркай, куніцамі — лясной і каменнай, амерыканскай норкай, андатрай і лясным тхаром. Прадоўжыцца асенне-зімовы сезон палявання на пушных паляўнічых жывёл да 29 студзеня 2023 года.

У працэсе правядзення вышэйназваных паляванняў дазваляецца здабыча ваўка, шакала, лісіцы, янотападобнага сабакі, шэрай вароны і сарокі (пры любым законным знаходжанні паляўнічага ў паляўнічых угоддзях у мэтах палявання).

Найбольш папулярнымі аб'ектамі загоннага палявання на капытных з'яўляюцца лось, высакародны алень, казуля і дзік. У адпаведнасці з Правіламі палявання загоннае паляванне дазволена ў светлы час сутак. Пры гэтым дапускаецца здабыча капытных паляўнічых жывёл любога полу і ўзросту з улікам устаноўленых для паляўнічых гаспадарак норм іх канфіскацыі, у тым ліку па поле, узросце і якасці (трафейныя, нетрафейныя).

Для здабычы лася, высакароднага аленя, лані, дарослага дзіка старэйшых за два гады дазваляецца выкарыстоўваць наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй кулі звыш 3000 джоуляў, гладкаствольную паляўнічую зброю з выкарыстаннем патронаў з куляй, паляўнічыя лукі і арбалеты. Для здабычы плямістага аленя, казулі, муфлона і маладняку дзіка (ва ўзросце да двух гадоў) дазваляецца выкарыстоўваць наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй кулі звыш 1500 джоуляў, гладкаствольную паляўнічую зброю з выкарыстаннем патронаў з куляй. Пароды паляўнічых сабак, якія выкарыстоўваюцца на загонных паляваннях, вызначаюцца па рашэнні карыстальніка паляўнічых угоддзяў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



# «КІТАЙСКА-БЕЛАРУСКАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА ПОЙДЗЕ ПА ПАСКОРАНЫМ ШЛЯХУ РАЗВІЦЦЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гэта азначае, што кітайска-беларускія адносіны здзейснілі гістарычны скачок, а таксама што супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі ў розных галінах адкрыла новыя перспектывы развіцця.

У ходзе сустрэчы кіраўнікі дзвюх дзяржаў высока ацанілі дасягненні кітайска-беларускага супрацоўніцтва ў розных галінах за 30 гадоў з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Кітаем і Беларуссю, правялі паглыблены абмен думкамі і дасягнулі шырокіх дамоўленасцяў па кітайска-беларускіх адносінах, а таксама па агульных міжнародных і рэгіянальных заклапочанасцях. Пасля сустрэчы была прынята Сумесная дэкларацыя аб устанаўленні адносін усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства паміж Кітайскай Народнай Рэспублікай і Рэспублікай Беларусь, а таксама былі падпісаны дакументы аб супрацоўніцтве ў галіне навукі і тэхналогій, юстыцыі, сельскай гаспадаркі, электроннай камерцыі і гэтак далей, што, несумненна, надае новы імпульс паглыбленню і пашырэнню двухбаковага супрацоўніцтва ў розных галінах. Цяпер Кітай і Беларусь актыўна рэалізуюць важныя дамоўленасці, дасягнутыя кіраўнікамі дзвюх дзяржаў, і прасоўваюць кітайска-беларускае супрацоўніцтва на карысць дзвюх краін і народаў.

***— Як вы характарызуеце дынаміку кітайска-беларускага супрацоўніцтва на дадзеным этапе ў кантэксце прынятай Сумеснай дэкларацыі?***

— «Сумесная дэкларацыя аб устанаўленні адносін усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства паміж Кітайскай Народнай Рэспублікай і Рэспублікай Беларусь» ахоплівае палітыку, эканоміку, гандаль, фінансы, навуку і тэхналогіі, адукацыю, культуру, абарону, правасуддзе і многія іншыя галіны, адлюстроўвае агульны клопат кіраўнікоў дзвюх краін аб двухбаковым супрацоўніцтве ў розных галінах, а таксама вызначае дарожную карту для будучага развіцця кітайска-беларускіх адносін. Згодна з дамоўленасцямі, дасягнутымі кіраўнікамі дзвюх дзяржаў, Кітай і Беларусь прадоўжаць паглыбляць абмены на высокім і ўсіх узроўнях, умацоўваць абмены і супрацоўніцтва паміж заканадаўчымі органамі, а таксама пашыраць прамыя кантакты паміж міністэрствамі і ведамствамі, рэгіёнамі і грамадскімі арганізацыямі дзвюх краін. Абодва бакі будуць актыўна ўзгадняць нацыянальныя стратэгіі развіцця, рэалізоўваць Ініцыятывы па глабальным развіцці і глабальнай бяспецы, разам прыкладаць намаганні па стварэнні Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва. Абодва бакі будуць і надалей садзейнічаць высакаякаснаму супрацоўніцтву ў сумесным будаўніцтве «Аднаго пояса, аднаго шляху», паглыбляць двухбаковае гандлёва-эканамічнае, інвестыцыйнае і фінансавае супрацоўніцтва, садзейнічаць далейшаму развіццю Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка, сумесна ствараць бяспечны і бесперашкодны рух грузавых цягнікоў Кітай — Еўропа. Краіны будуць умацоўваць супрацоўніцтва ў сферы лічбавізацыі, прасоўваць лічбавыя тэхналогіі ў гандлі таварамі і паслугамі, развіваць электронную камерцыю. Бакі прадоўжаць умацоўваць дзелавое супрацоўніцтва ў мытнай і транспартна-лагістычнай сферы, актыўна развіваць транзітна-транспартны патэнцыял Беларусі, падтрымліваць павелічэнне рэгулярных авіярэйсаў з Беларусі ў Кітай. Мяркуецца ўмацоўваць навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва і пашыраць практычнае ўзаемадзеянне паміж навукова-даследчымі інстытутамі, ВНУ і прадпрыемствамі дзвюх краін. Кітай і Беларусь будуць і надалей павялічваць двухбаковыя кантакты ў сферы абароны, правасуддзя, праваахоўнасці і бяспекі, аварыйна-ратавальных службаў, а таксама пашыраць супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, культуры, турызму, кіно, тэлебачання, спорту, сродкаў масавай інфармацыі і гэтак далей. Бакі таксама прадоўжаць дзяліцца адзін з адным перадавым вопытам барацьбы з пандэміяй COVID-19 і вызначылі прыярытэтныя напрамкі супрацоўніцтва стварэння сумесных фармацэўтычных прадпрыемстваў, камерцыялізацыі новых прэпаратаў і тэхналогій, а таксама стварэнне ў Беларусі высакаякасных цэнтраў традыцыйнай кітайскай медыцыны. Пад стратэгічным кіраўніцтвам кіраўнікоў дзвюх дзяржаў кітайска-беларускае супрацоўніцтва набірае поўныя абароты і, несумненна, пойдзе па паскораным шляху развіцця, бесперапынна пашыраючы перспектывы развіцця.

***— Наколькі зблізіліся нашыя краіны за тры дзесяцігоддзі дыпламатычных адносін?***

— З моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін 30 гадоў таму ўзровень кітайска-беларускіх адносін павышаўся чатыры разы — з «сяброўскіх адносін супрацоўніцтва», «адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства», «адносін даверанага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва» да «адносін усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства», дасягнуўшы рэкорднага ўзроўню. Абодва бакі паважаюць і падтрымліваюць абраны адзін адным шлях развіцця, унутраную і знешнюю палітыку, цвёрда падтрымліваюць адзін аднаго па пытаннях, якія датычацца карэнных інтарэсаў дзвюх краін. Кітай і Беларусь цесна ўзаемадзейнічаюць у ААН і іншых міжнародных арганізацыях, падтрымліваюць сувязь і каардынацыю па міжнародных і рэгіянальных пытаннях, якія маюць узаемную цікавасць, і сумесна прасоўваюць такія агульныя каштоўнасці чалавецтва, як мір, развіццё, роўнасць, справядлівасць, дэмакратыя і свабода.

Практычнае супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі пастаянна рушыць наперад, сумеснае будаўніцтва «Аднаго пояса, аднаго шляху» дасягнула ўражальных вынікаў. Паводле даных кітайскага боку, аб'ём тавараабароту паміж Кітаем і Беларуссю павялічыўся з 60,8 млн долараў ЗША ў пачатку ўстанаўлення дыпламатычных адносін да 3,822 млрд долараў ЗША летась, павялічыўшыся амаль у 62 разы. Сёлета ў студзені — жніўні аб'ём двухбаковага гандлю дасягнуў 2,966 млрд долараў ЗША, павялічыўшыся на 18,5 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, у тым ліку імпарт Кітая з Беларусі павялічыўся на 67,5 працэнта. Беларусь адной з першых краін адгукнулася і прыняла актыўны ўдзел у ініцыятыве Кітая «Адзін пояс, адзін шлях». Сумесна пабудаваны двума бакамі Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень» стаў насамрэч «жамчужынай Эканамічнага пояса Шаўковага шляху».

Гуманітарны абмен пастаянна паглыбляецца, а супрацоўніцтва ў такіх галінах, як адукацыя, культура, спорт, СМІ і іншыя, набірае абароты з году ў год. Нашы краіны паспяхова правялі «Год турызму» і «Год адукацыі», неаднаразова ладзілі фестывалі мастацтваў, дні культуры, тыдні кіно, фотавыставы і іншыя мерапрыемствы. Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі стала новым пунктам росту, колькасць пабрацімскіх правінцый, абласцей і гарадоў дасягнула 36 пар. Усе шэсць абласцей Беларусі і горад Мінск устанавілі пабрацімскія адносіны з адпаведнымі кітайскімі правінцыямі і гарадамі. З моманту ўспышкі пандэміі COVID-19 дзве краіны падаюць адна адной супрацьэпідэмічныя матэрыялы і абменьваюцца вопытам па барацьбе з пандэміяй. Кітайскі бок бязвыплатна перадаў беларускаму некалькі партый вакцыны супраць COVID-19 агульным аб'ёмам 2,9 мільёна доз, аказаўшы эфектыўнае садзейнічанне Беларусі ў барацьбе з пандэміяй, абароне жыцця і здароўя насельніцтва, што адлюстроўвае сапраўднае значэнне выказвання «сябар спазнаецца ў бядзе». Можна сказаць, што Кітай і Беларусь — сапраўдныя, добрыя сябры і партнёры, а адносіны паміж краінамі вартыя звання «усепагоднае і ўсебаковае стратэгічнае партнёрства».

***— Як праходзіць Год рэгіёнаў Беларусі і Кітая?***

— У студзені мінулага года Старшыня Сі Цзіньпін і Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падчас тэлефоннай размовы прынялі рашэнне аб'явіць 2021-ы і 2022-і гады «Гадамі рэгіёнаў Кітая і Беларусі». У сярэдзіне гэтага месяца, калі кіраўнікі дзвюх дзяржаў сустрэліся ў Самаркандзе, яны высока ацанілі правядзенне Года рэгіёнаў Кітая і Беларусі. Старшыня Сі Цзіньпін падкрэсліў, што абодва бакі павінны прадаўжаць ажыццяўляць адпаведныя мерапрыемствы, з чым пагадзіўся Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

У мінулым годзе Кітай і Беларусь сумесна рэалізавалі больш чым 100 розных праектаў міжрэгіянальнага супрацоўніцтва і абмену з удзелам большасці правінцый і гарадоў Кітая, усіх 6 абласцей і сталіцы Беларусі, а таксама асноўных дзяржаўных ведамстваў дзвюх краін, што эфектыўна садзейнічала развіццю ўзаемаразумення і кантактаў паміж рэгіёнамі Кітая і Беларусі, а таксама адыграла незаменную ролю ў развіцці дзелавога супрацоўніцтва і гуманітарнага абмену паміж дзвюма краінамі. Сёлета мы дамовіліся правесці яшчэ больш чым 50 мерапрыемстваў супрацоўніцтва і абмену, у тым ліку цырымоніі падпісання пагадненняў аб устанаўленні пабрацімскіх адносін паміж гарадамі, абмены візітамі дэлегацый, прэзентацыі, дзелавыя канферэнцыі, навуковыя форумы, семінары, тыдні музыкі, фотавыставы, мерапрыемствы па супрацоўніцтве ў галіне медыцыны і гэтак далей. У нас ёсць падставы меркаваць, што ў рамках Года рэгіёнаў міжрэгіянальнае супрацоўніцтва паглыбіцца, формы правядзення абменаў стануць усё больш разнастайнымі, а сяброўства паміж кітайскім і беларускім народамі ўзмоцніцца. Мы зробім усё магчымае для ажыццяўлення важных дамоўленасцяў, дасягнутых кіраўнікамі дзвюх дзяржаў, рэгіёнамі дзвюх краін і стварэння новай старонкі ў кітайска-беларускім міжрэгіянальным супрацоўніцтве.

***— Як ажыццяўляецца ўзаемадзеянне ў рамках транскантынентальнай ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях»?***

— З таго часу, як восенню 2013 года Старшыня Сі Цзіньпін вылучыў ініцыятыву «Адзін пояс, адзін шлях», яна стала самай шырокай і маштабнай у свеце пляцоўкай міжнароднага супрацоўніцтва. Асабліва ў кантэксце таго, што пандэмія COVID-19 зацягваецца на доўгі час, канфлікты ў сусветнай эканоміцы і палітыцы абвастраюцца, а дэфіцыт міру, развіцця і кіравання становіцца сур'ёзнай праблемай, якая стаіць перад усім чалавецтвам, ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях» стала эфектыўным рашэннем, што дазваляе справіцца з нябачанымі за стагоддзе велізарнымі зменамі, што ўвасабляе мудрасць Кітая.

КНР падпісаў больш чым 200 дакументаў аб супрацоўніцтве па сумеснай рэалізацыі ініцыятывы са 150 краінамі і 32 міжнароднымі арганізацыямі. Сукупны тавараабарот з дзяржавамі, якія размешчаны ўздоўж маршруту «Аднаго пояса, аднаго шляху», перавысіў 10 трыльёнаў долараў ЗША, а прамыя інвестыцыі ў гэтыя краіны перавысілі 161,3 млрд долараў ЗША. У самым актуальным для цяперашняга свету пытанні — аб барацьбе з пандэміяй — Кітай першым выступіў з прапановай зрабіць вакцыны глабальным агульнадаступным дабром і вылучыў Ініцыятыву партнёрства «Аднаго пояса, аднаго шляху» па супрацоўніцтве ў галіне вакцын супраць COVID-19. Грузавыя цягнікі Кітай — Еўропа стварылі жыццёва важны бесперашкодны канал для глабальнай барацьбы з пандэміяй. Нягледзячы на сур'ёзнае ўздзеянне пандэміі на сусветную эканоміку, супрацоўніцтва ў рамках ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» не толькі не спынілася, але і рушыла наперад, саграваючы халодную зіму сусветнай эканомікі і становячыся для краін уздоўж маршруту шляхам супрацоўніцтва, здароўя, аднаўлення і росту.

Беларусь з'яўляецца перакананым прыхільнікам і важным удзельнікам ініцыятывы. Грунтуючыся на прынцыпах роўнасці, узаемнага выйгрышу і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, нашы краіны планамерна, крок за крокам прасоўваюць сумеснае будаўніцтва «Аднаго пояса, аднаго шляху», паглыбляючы супрацоўніцтва ў галіне гандлю, інвестыцый, інфраструктуры, вытворчых магутнасцяў, транспарту і гэтак далей. Паводле статыстыкі кітайскага боку, сёлета ў першым паўгоддзі колькасць рэйсаў грузавых цягнікоў Кітай — Еўропа паміж нашымі краінамі дасягнула 565, павялічыўшыся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 14 працэнтаў, што адыграла станоўчую ролю ў падтрыманні стабільнасці пастаўачнага ланцужка двухбаковага гандлю.

Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк, які з'яўляецца знакавым праектам супрацоўніцтва «Адзін пояс, адзін шлях», дабіўся значнага прагрэсу пасля сумеснага наведвання Старшыні Сі Цзіньпіна і Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ў маі 2015 года. Зараз рэзідэнтамі Парка сталі 94 кампаніі з 15 краін з заяўленымі інвестыцыямі ў памеры больш за 1,25 мільярда долараў ЗША. Кампаніі працуюць у такіх галінах, як машынабудаванне, біямедыцына, новыя матэрыялы, электронныя камунікацыі і гэтак далей. Трэба адзначыць, што Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк стаў урадлівай зямлёй для развіцця бізнесу ў Беларусі для кампаній Кітая і шэрагу іншых краін, стварыў новую платформу для прыцягнення замежных інвестыцый, павышэння канкурэнтаздольнасці прадукцыі і пашырэння знешняга гандлю.

Кітай гатовы прыкладаць сумесныя намаганні з Беларуссю да таго, каб у поўнай меры выкарыстаць яе геаграфічную перавагу як краіны, якая знаходзіцца ў самым цэнтры Еўразійскага кантынента, няўхільна прасоўваць будаўніцтва Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка, забяспечваць стабільнасць і бесперашкоднасць трансгранічных грузавых цягнікоў Кітай — Еўропа, выкарыстоўваць атрымавыя дывідэнды развіцця для садзейнічання экспарту беларускіх высакаякасных тавараў у Кітай, у тым ліку сельскагаспадарчай прадукцыі. Вельмі важна прасоўваць рэгіянальнае ўзаемавыгаднае эканамічнае супрацоўніцтва праз сумеснае будаўніцтва «Аднаго пояса, аднаго шляху», каб кітайска-беларускія адносіны ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства служылі на карысць нашых краін і народаў.

***— Ад усёй душы віншуем вялікую краіну з вялікім святам — Днём утварэння КНР. Жадаем працвітання, дабрабыту і новых перамог!***

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

## З нагоды

### «МІНСК РАЗАМ З ПЕКІНАМ СПРЫЯЕ ФАРМІРАВАННЮ НОВАГА СПРАВЯДЛІВАГА СВЕТАПАРАДКУ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя дружалюбнага беларускага народа і сябе асабіста выказаў самыя цёплыя і шчырыя віншаванні Старшыні КНР Сі Цзіньпіну з нагоды Дня ўтварэння Кітайскай Народнай Рэспублікі.

«Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ваша краіна робіць рашучыя крокі для рэалізацыі «мэты другога стагоддзя», становіцца ўсё больш сучаснай, квітнеючай і моцнай дзяржавай, — адзначаецца ў віншаванні. Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, беларуска-кітайскае супрацоўніцтва з кожным днём узбагачаецца новымі элементамі і паслядоўна ўмацоўваецца. «Мінск застаецца актыўным удзельнікам ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» і яе спалучэння з Еўразійскім эканамічным саюзам, разам з Пекінам спрыяе фарміраванню новага справядлівага светапарадку, дзе паважаюць голас кожнай без выключэння дзяржавы, — падкрэсліў беларускі лідар. — Перакананы, што на сучасным этапе развіцця міжнародных адносін Беларусь і Кітай узмоцняць сумесную каардынацыю дзеянняў у сферах знешняй палітыкі і эканомікі, будуць ажыццяўляць новыя ініцыятывы для паглыблення двухбаковага супрацоўніцтва».

# ШТО АГУЛЬНАГА Ў КОСМАСУ З ПАТЭЛЬНЯЙ?

## Як сямейная пара настаўнікаў фізікі робіць складанае простым

**У сям'і ЯКУБОЎСКІХ з Жодзіна з фізікай сябруюць усе. Эла Мікалаеўна выкладае гэты вучэбны прадмет у гарадской гімназіі № 1. Яе муж Аляксандр Уладзіміравіч — у жодзінскай сярэдняй школе № 9. Старэйшы сын Захар скончыў факультэт радыёфізікі БДУ, а малодшы Яраслаў зараз навучаецца на трэцім курсе таго ж факультэта. Сям'я Якубоўскіх — адзіная ў краіне, дзе і муж, і жонка мае катэгорыю «настаўнік-метадыст». Між іншым, яе наяўнасць — сведчанне найвышэйшага пілатажу ў прафесіі і гатоўнасці дзяліцца з калегамі сваімі прафесійнымі ідэямі і знаходкамі, што яны з задавальненнем і робяць. «Калі я праводжу майстар-клас, а напрыканцы мне дзесяць хвілін апладзіруюць некалькі дзясяткаў педагогаў, я атрымліваю сапраўдны кайф ад таго, што мой вопыт будзе камусьці карысны», — прызнаецца Эла Мікалаеўна.**



### НА СВАІМ МЕСЦЫ

Цікава, што сям'я Якубоўскіх стварылася амаль трыццаць гадоў таму ў Жодзінскім ліцэі (пазней ён стаў восьмай гарадской школай), куды з розніцай у год прыйшлі маладыя педагогі. Але калі Аляксандр адразу быў нацэлены менавіта на работу ў школе і скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут (цяпер БДПУ), то яго будучая жонка навучалася ў БДУ на фізічным факультэце на вытворчым патоку, і яе спецыялізацыяй была атамная фізіка і фізічная інфарматыка. Але ў 1992 годзе пасля распаду вялікай краіны працы для спецыяліста ў атамнай фізіцы не было, а вось настаўнікі фізікі патрабаваліся. Так Эла Мікалаеўна апынулася ў школе. Спачатку думала, што гэта ненадоўга, але вельмі хутка высветлілася, што яна — на сваім месцы. Смяецца, што ад сваёй лёсу не збяжыш. Яшчэ ў пачатковай школе на пытанне, кім ты хочаш стаць, адказвала: настаўніцай. Безумоўна, у захапленні дакладнымі навукамі вялікую ролю адыгралі педагогі. **У Элы Мікалаеўны фізіку выкладаў Яўген Паўлінавіч Сяргееў — найлепшы настаўнік фізікі ў горадзе, строгі, сумленны і справядлівы, сапраўдная легенда.** І ў бацькоў, і ў дзяцей ён карыстаўся безумоўнай павагай. Дарэчы, як толькі яна прыйшла ў школу, ён, сыходзячы на пенсію, перадаў сваёй былой вучаніцы ўсю сваю метадычную літаратуру. З цеплынёй прыгадвае сваіх педагогаў і Аляксандр Уладзіміравіч: Пётр Васільевіч Хацкевіч выкладаў у Пліскай сярэдняй школе, дзе ён навучаўся, фізіку, а Іван Эдуардавіч Ярмаловіч — матэматыку.

Дарэчы, **маладая сям'я сыграла сваё вяселле ў Дзень настаўніка.** А потым больш за дваццаць гадоў муж і жонка працавалі ў адной навучальнай установе. «У школе былі два кабінеты фізікі: у яго і ў мяне. Мы выкладалі ў тэхнічных класах, потым у фізіка-матэматычных. Калі нарадзіліся сыны, то ўсе клопаты дзялілі на дваіх, — расказвае Эла Мікалаеўна. — Не толькі я, але і муж сядзеў на бальнічных з дзецьмі, што для Жодзіна, дзе горадаўтваральным прадпрыемствам з'яўляецца «мужчынскі» «БелАЗ», нехарактэрна. Ён адпускаў мяне і на навучальныя курсы, і на фестывалі педагагічнага майстэрства, і на майстар-класы. У нас ніколі не было непаразумення. Мы абодва самарэалізоўваліся ў прафесіі без шкоды для нашай сям'і. Былі адзін у аднаго на падхваце. Гэта шчасце, калі ў сям'і размаўляюць на адной мове, калі ты можаш падзяліцца сваёй праблемай, сумненнямі і перамогамі не проста з мужам, а з калегай і сапраўдным прафесіяналам».

### ЗРАЗУМЕЦЬ І... ПАЛЮБІЦЬ

Фізіка традыцыйна лічыцца адной з самых складаных школьных дысцыплін. Электрастатыка, тэрмадынаміка, асновы МКТ, механічныя хістанні і хвалі, оптыка, кінематыка, квантавая механіка... Гуманітарыі ўвогуле прыгадваюць школьны курс з ціхім жахам. Між іншым, Аляксандр Якубоўскі некалькі гадоў выкладаў фізіку ў Жодзінскай жаночай гімназіі. Цікавімся ў педагогаў, а ці ўсе могуць «пасябраваць» з фізікай, ці ўвогуле ці трэба гэта ўсім? Настаўнікам аптымізму не займаць. «Проста не вучы фізіку ў школе, і ўсё тваё жыццё будзе напоўнена цудамі і чараўніцтвам, — смяюцца яны. — Усё, што акружае чалавека, гэта фізіка. Яна вучыць нас жыць і ўзаемадзейнічаць з навакольным светам. Як працуюць нашы мабільныя тэлефоны? Чаму небяспечна ездзіць са сцёртымі шынамі? Чаму адбываюцца сонечныя і месяцовыя зацьменні? Што такое эфект Гало? Усё гэта тлумачыць фізіка. Матэматыка — гэта мова, на якой размаўляе фізіка, але матэматыка — навука абстрактная, а фізіка — канкрэтная. Каб зачапіць увагу вучняў, можна выкарыстоўваць ключавыя пытанні. Чаму крынічная вада не замярзае зімой? Што агульнага ў космасу з патэльняй? Ці можна зрабіць так, каб вада кіпела толькі ў палове пасудзіны? Чаму высока ў гарах вывіхі ў людзей адбываюцца часцей, чым унізе? Ці магчыма зрабіць, каб цела рухалася бясконца? Здавалася б, элементарныя пытанні, але ці можаце вы даць на іх хуткі адказ? Ключавыя пытанні — той «кручок», які не адпускае ўвагу вучня, пакуль задача не будзе вырашана. Дзякуючы адкрыццям фізікі сёння даследчыкі і мастацтвазнаўцы могуць «убачыць» гістарычную падоснову ці мастацкую карціну знутры. Рэстаўратары і мастацтвазнаўцы могуць «убачыць» гістарычную падоснову ці мастацкую карціну знутры. А што такое кардыяграма сэрца? Гэта вельмі прыгожая асцылаграма, электрычныя імпульсы, якія ідуць з розных абласцей сэрца... **Далёка не ўсе з нашых навучэнцаў будуць рашаць пасля школы задачы па фізіцы, але ўсе павінны разумець, як дзейнічаюць базавыя фізічныя законы.** Наша задача — навучыць дзіця думаць, аналізаваць, супастаўляць...»

«Веданне фізікі патрэбнае ўсім, — кажа Аляксандр Якубоўскі. — Іншая справа — на якім узроўні? Адным фізіка патрэбна для будучай прафесіі, другім — для здачы ЦТ, трэцім — для таго, каб ведаць элементарныя рэчы. **Я — справядлівы настаўнік, і ў вучні, у першую чаргу, паважаю яго асобу. А тое, наколькі ён разбіраецца ці не разбіраецца ў фізіцы, для мяне зусім не важнае. Ён можа ведаць фізіку роўна настолькі, наколькі ён хоча яе ведаць. Трэба паважаць яго выбар.** Часта кажу дзецям: «Я ведаю і ўмею столькі, што магу вас гэтаму навучыць. Магчыма, вам гэта ў жыцці калісьці спатрэбіцца...»

### ДРЭННЫ МАТЫВАТАР

«Настаўнік павінен верыць у сваіх вучняў. Тады гэта вера ім перадаецца. Вынікі любога з іх могуць змяніцца да лепшага, бо не з'яўляюцца раз і назаўсёды зададзенай велічынёй. Мая задача — спачатку навучыць вучня рашаць задачы і толькі потым ацэньваць гэта ўменне, інакш вучні будуць баяцца дапусціць памылку. І яны павінны ведаць крытэрыі, па якіх будзе ацэньвацца іх работа. Апошнія павінны быць празрыстыя. Мы не ставім задачу — злавіць вучняў на няведанні. Не хаваем ад іх, якія будуць заданні на кантрольнай. Між іншым, усе кантрольныя работы ў нас з мужам — аўтарскія, каб у дзяцей не было спакусы спісаць. Яны не ведаюць зместу заданняў, але якія будуць заданні, для іх не сакрэт, — падкрэслівае Эла Мікалаеўна. — Калі дзеці ведаюць «правілы гульні» — яны іх прымаюць.

Для мяне якасны ўрок — той, напрыканцы якога вучань кажа: «Я зразумеў» ці «Я гэта магу». Няхай хтосьці вырашыць задачку другога ўзроўню, а хтосьці — алімпіядную задачку, усё залежыць ад пастаўленай мэты. **Самы ўдзячны момант у працэсе выкладання — пачуць ад вучня вокліч: «Ого! Дык вось яно што!»** Я разумею, што менавіта ў гэты момант ён пераходзіць на новы ўзровень ведаў ці набывае новы навык і гатовы ісці далей. Даўно пераканалася, што школьная адзнака — дрэнны матыватар. У мяне ёсць вучань, які прыйшоў у фізіка-матэматычны клас з «сямёркай». Гэта той мінімум, з якім можна прыйсці ў профільны клас. Але ў яго была ўнутраная матывацыя, ён збіраецца паступаць на інжынерную спецыяльнасць у БНТУ, да таго ж юнак трапіў у асяроддзе такіх жа матываваных дзяцей і за год вышаў ужо на моцную «дзявятку». І ў мяне, і ў мужа ёсць вучні, якія атрымалі на ЦТ па фізіцы сто балаў. Канешне, гэта цешыць наша самалюбства, але больш важна для нас, каб кожны наш выпускнік знайшоў сваё месца ў жыцці і самарэалізаваўся. І калі мы можам ім у гэтым дапамагчы, значыць, працуем недарэмна».

Пытаемся ў суразмоўцаў, а ці адкрыта наша школа да новых ідэй? Якія адукацыйныя тэхналогіі могуць забяспечыць якасць адукацыі ў адпаведнасці з выклікамі часу, калі ўсе веды знаходзяцца ад вучня на адлеглі адлегласці аднаго кліку?

— Нават пры наяўнасці мабільных тэлефонаў і сацыяльных сетак законы Ньютана дзеці самастойна не засвояць, калі ім не раскажуць пра іх у школе. **Важна, каб вучань не толькі ўмеў правільна «гугліць». Ён павінен крытычна ацэньваць атрыманую інфармацыю. І — самае галоўнае — скласці сваё меркаванне,** — кажа Эла Якубоўская. — Гэта найважнейшая чытацкая кампетэнцыя. Метады навучання, якія раней звычайна выкарыстоўваліся на ўроках, не заўсёды працуюць на фарміраванне медыякампетэнцый вучня. Гэту праблему ўскладняе інфармацыйны выбух. Розныя віды медыя выдаюць супярэчлівую, часам узаемавыключальную, інфармацыю пра адны і тыя ж падзеі, навуковыя адкрыцці і актуальныя праблемы сучаснасці. Працаваць над развіццём крытычнага мыслення можна на любых прадметах. Мая задача — навучыць працаваць на ўроку фізікі з фізічнай інфармацыяй, якая сустракаецца ў медыякрыніцах. Вельмі карысная для фарміравання крытычнага мыслення работа з рэкламай. Што могуць азначаць тэрміны, якімі аперыруюць рэкламадаўцы: «квантавая медыцына», «паліфактарнае ўздзеянне», «бактэрыцыдная сіняе святло», «экалагічна бяспечныя выпраменьванні»? Як чырвонае святло можа справіцца з хранічнымі захворваннямі? Ці можа сіняе святло аказваць заспакаяльнае і абязбольвальнае ўздзеянне? Што трэба ведаць, каб не «павесціся» на такую рэкламу?

Фізічныя памылкі сустракаюцца ў мастацкай, навукова-фантастычнай і навучальнай літаратуры, у журналісцкіх артыкулах, шмат іх у кінафільмах. Ёсць жарт на гэтую тэму: «Глядзеў фільм і плакаў». — «А чаму плакаў?» — «Таму што фізік!»

Сярод эфектыўных тэхналогій навучання настаўнікі згадваюць фарміруючае ацэньванне (у Беларусі гэта актыўная ацэнка), кааператыўнае навучанне, праектнае навучанне і даследчы падыход.

— Якія ўменні і навыкі патрабуюцца чалавеку ў ХХІ стагоддзі? Камунікатыўнасць, творчасць і дапытлівасць, уменне працаваць з інфармацыяй, крытычнае і сістэмнае мысленне, уменне фармуляваць і вырашаць праблемы, скіраванасць на самаразвіццё, сацыяльная адказнасць, навыкі каманднай работы. Актыўная ацэнка вучыць дзяцей навыкам самаацэньвання, рэфлексаваць сваю дзейнасць — гэта вельмі важны навык, — разважаюць нашы суразмоўцы. — Праектнае навучанне — планаваць сваю дзейнасць і прэзентаваць яе вынікі. Нават пры працаўладкаванні ты павінен умець сябе прэзентаваць і рабіць гэта эфектна і максімальна пераканаўча. Трэба ўмець працаваць на агульную мэту ў камандзе, таму што ўсе адкрыцці сёння робіцца на стыку навук у міждысцыплінарных камандах.

### ФОРМУЛА ПАСПЯХОВАГА ЧАЛАВЕКА

Дарэчы, абодва сыны ў сямейнай пары Якубоўскіх захапляліся даследчымі работамі, былі пераможцамі міжнародных канферэнцый і конкурсаў навуковых і даследчых работ. Маглі паступіць у любую ВНУ на самую прэстыжную спецыяльнасць, у тым ліку і па выніках ЦТ, маючы вельмі высокія балы, але выбралі факультэт радыёфізікі БДУ. Тлумачаць, што радыёфізіка — гэта сімбіёз фізікі і тэхнікі, які дае значна больш магчымасцяў, каб выбраць сабе пазней спецыялізацыю. У школьныя гады яны былі ўдзельнікамі Рэспубліканскай летняй навукова-даследчай школы ў спартыўна-аздараўленчым комплексе «Брыганціна» БДУ, а калі сталі студэнтамі — накіраваліся туды ў якасці важатых, кіравалі даследчымі работамі падлеткаў, распрабавалі сябе і ў педагагічнай дзейнасці.

А ці ёсць у сям'і яшчэ што-небудзь, акрамя фізікі, што ўсіх аб'ядноўвае?

— Наша лецішча, — адказвае Эла Мікалаеўна. — Мой муж любіць будаваць і добраўпарадкоўваць, працаваць сваімі рукамі і сыны яму ў гэтым дапамагаюць. Для яго важна, каб нам усім там было камфортна. Таму ў нас ёсць на лецішчы і душ, і лазня, і ацяпленне, і альтанкі. На жаль, месца для будаўніцтва ўжо скончылася (*смяецца.* — **Аўт.**). А я люблю вырошчваць кветкі, таматы, агуркі. Канешне, я ўсё гэта магу купіць. Але для мяне такая праца — адпачынак і магчымасць пераключыцца. У выхадныя мы школьнымі справамі прынцыпова не займаемся. У педагога павінны быць асабістае жыццё і асабістая тэрыторыя. Пакуль дзеці не выраслі, мы заўсёды адпачывалі разам, разам вандравалі па Беларусі і за яе межамі. На Дзень настаўніка ўсе абавязкова збяромся за адным сталом. Раней у нас было яшчэ адно сямейнае свята — Дзень машынабудаўніка, бо мае бацькі стаялі ля вытокаў «БелАЗа». А цяпер там працуе шмат нашых выпускнікоў, прычым на кіраўніцкіх пасадах.

Некаторыя з вучняў пытаюцца: «А ці не пашкадавалі вы, што сталі настаўнікам?» Я ім адказваю, што калі вы будзеце прафесіяналам у той справе, якую абралі, то будзеце паспяховым чалавекам. Работа павінна прыносіць задавальненне і матэрыяльны дастатак, але на першае месца трэба ставіць усё ж такі задавальненне ад таго, што ты робіш. Мне ўдалося спалучыць і першае, і другое. Я матэрыяльна забяспечаны чалавек. І, дзякуючы дзецям, заўсёды адчуваю сябе маладой.

— У апошнія гады дзеці часта кажуць: «Дзякуй вам за ўрок!», і гэта натхняе. Дзевяцікласнікі пытаюцца: «А калі я прыйду да вас у фізіка-матэматычны клас, вы мяне возьмеце?» — «А табе не будзе складана?» — «Няхай будзе складана, але я хачу вучыцца ў вас». Напэўна, гэта пра штосьці сведчыць? Дзеці выбіраюць не толькі профіль, але і настаўніка. 22 пары дзіцячых вачэй глядзяць на цябе, вучні гатовы з табой камунікаваць увесь урок, а не адседжвацца. Значыць, я на сваім месцы!»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Фота з асабістага архіва герояў.**

*Поўны тэкст і больш фота на сайце zviazda.by.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38. Тел.: + 375 29 688-04-88 |

**Предмет повторного аукциона, назначенного на 17.10.2022**

**Лот № 1**

**Офисная мебель и оргтехника в составе 437 единиц:** ПЭВМ, коммутаторы, кондиционеры, счетчики банкнот, копир. аппараты, пожар. сигнализация, источники бесперeб. питания, компьют. сеть, система симметрич. связи, счетно-денеж. машинки, мебель, кабельная телеф. линия, системы вентиляции и кодиционирования воздуха, сейфы, комплекты перегородок, аппарат нагрева-охлаждения воды, рольшторы (полный перечень см. на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**). Местоположение **– г. Минск, ул. Замковая, 3**

**Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 183 461,76 бел. руб.** (снижена на 10 %). Шаг аукциона – 9173,09 бел. руб.

**Лот № 2**

**Помещение санитарно-бытового назначения** (**1,7 кв. м,** инвен. № 500/D-7028275). Адрес: **г. Минск, ул. Лили Карастояновой, 32-19**

**Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 2 700,00 бел. руб.** (снижена на 10 %). Шаг аукциона – 135,00 бел. руб.

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.07.2022

**Дата и время проведения аукциона по лотам №№ 1,2: 17.10.2022 в 12.00, начала и окончания приема заявлений: с 09.00 03.10.2022 до 17.00 14.10.2022,** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Предмет аукциона, назначенного на 31.10.2022**

Местоположение лотов № 3–5 – **Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, направление ТЭЦ-4, 3-й пер. Монтажников**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентар. номер | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|---|
| **Лот № 3** | | | |
| **Изолированное помещение № 1** (производственное помещение) | 206,3 кв. м | 600/D-91728 | 3А-4 |
| **Изолированное помещение № 2** (административное помещение) | 221,7 кв. м | 600/D-91729 | 3А-4а |
| **Изолированное помещение № 3** (производственное помещение) | 288,4 кв. м | 600/D-91730 | 3А-4б |
| **Складское помещение** | 205,2 кв. м | 600/D-40243 | 3-7 |
| **Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 1 528 800,00 бел. руб.** Шаг аукциона – 76 440,00 бел. руб. | | | |
| **Лот № 4** | | | |
| **Административное помещение** (3-й этаж) | 233,6 кв. м | 600/D-40239 | 3-5 |
| **Начальная цена лота № 4 (с НДС 20 %) – 452 400,00 бел.руб.** Шаг аукциона – 22 620,00 бел.руб. | | | |
| **Лот № 5** | | | |
| **Административное помещение** (этаж 5) | 83,9 кв. м | 600/D-40241 | 3-6 |
| **Начальная цена лота № 5 (с НДС 20 %) – 176 400,00 бел. руб.** Шаг аукциона – 8 820,00 бел. руб. | | | |

Обременение: площади помещений (лоты №№ 3–5) частично сданы в аренду (с информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона ipmtorgi.by)

Местоположение лотов №№ 6,7 **– г. Минск, ул. Замковая, д. 33**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Лот № 6** | | | |
| **Административно-торговое помещение** | 733,5 кв. м | 500/D-7023833 | 33-6 |
| **Начальная цена лота № 6 (с НДС 20 %) – 1 926 000,00 бел. руб.** Шаг аукциона – 96 300,00 бел. руб. | | | |
| **Лот № 7** | | | |
| **Кабинеты с открытой автостоянкой пл. 523 кв. м** | 87,9 кв. м | 500/D-708041778 | 33-1а |
| **Начальная цена лота № 7 (с НДС 20 %) – 348 000,00 бел. руб.** Шаг аукциона – 17 400,00 бел. руб. | | | |

**Дата и время проведения аукциона по лотам №№ 3–7: 31.10.2022 в 12.00, начала и окончания приема заявлений: с 09.00 03.10.2022 до 17.00 28.10.2022,** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Порядок ознакомления:** в рабочие дня по предварительному согласованию, +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна)

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации на аукцион одного участника, предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB301200483 50080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить организатору аукциона вознаграждение по лотам № 1, № 2 – 4 %, № 3–7 – 3 % от цены продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@ipmconsult.by**

---

В **суд Борисовского района** поступило заявление Новикова Сергея Николаевича об объявлении НОВИКОВА Николая Николаевича, 11 сентября 1968 года рождения, умершим, последнее известное место жительства которого: Минская область, г. Борисов, б-р Гречко, д. 18, кв. 24.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о данном гражданине, сообщить суду в течение двух месяцев со дня публикации объявления.

---

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Каток дорожный CATERPILLAR CS-563E (рег. знак КА-7 0688), 2007 г. в. | 55440,00 | 5544,00 | 2772,00 |
| 2 | Каток дорожный Bomag BW154 AP (рег. знак КА-7 4513), 2011 г. в. | 54348,00 | 5434,80 | 2717,40 |
| 3 | Автомобиль Volkswagen LT35 (рег. Знак АА 6857-7), 2002 г. в. | 4704,00 | 470,40 | 235,20 |
| 4 | Вилочный погрузчик ЕВ 687.22 (инв. № 1163), 2008 г. в. | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 5 | Вилочный погрузчик CPCD25DT (инв. № 1554), 2009 г. в. | 12012,00 | 1201,20 | 600,60 |
| 6 | Прицепная установка для приготовления битумных дорожных строительных смесей СБ-500 (инв. № 3065), 2019 г. в. | 59136,00 | 5913,60 | 2956,80 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся третьи повторные торги. **Стоимость снижена на 30 %.** Ранее публикация о торгах размещалась в газете «Звязда» № 126 (29748) от 30.06.2022, стр. 10, № 159 (29781) от 16.08.2022, № 175 (29797) от 07.09.2022, стр. 14

**Местонахождение лота № 1:** ОАО «Минский тракторный завод» (г. Минск, ул. Долгобродская, 29); **лота № 2:** РУП «Белмедпрепараты» (г. Минск, ул. Маяковского, 1); **лота № 3:** аг. Сеница, ул. Парковая, 1; **лотов №№ 4, 6:** Боровляны, пос. Опытный, ул. Лагерная 20, **лота № 5:** Боровляны, ул. 40 лет Победы 19а

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **13 октября 2022 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **с 10.00 3 октября 2022 года до 16.00 12 октября 2022 года** |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ», проводимых 13.10.2022.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.** Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Андрей, +375293042560.**

8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375173515452, +375293396845, e-mail: pc-bel@tut.by (220090, г. Минск, улица Широкая, д. 4, УНП 600013209)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона/ оператор | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |
| Продавец | **ООО «Термотехстрой», г. Минск, пр-т Победителей, д. 117, пом. 42** |

| № лота | Предмет электронных торгов |
|---|---|
| 1 | **Казино (помещение для организации азартных игр)**, общ. пл. 779,2 кв. м, инв. № 500/D-978816933, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Свердлова, 11-328 |
| | **Начальная цена (с НДС)* – 1 122 048 долл. США.** (1 440 долл. США за 1 кв. м) |
| 2 | **Торговое помещение** (торговое помещение), общ. пл. 6 088,3 кв. м, инв. № 500/D-978816931, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Свердлова, 11-327 |
| | **Начальная цена (с НДС)* – 7 671 258 долл. США.** (1 260 долл. США за 1 кв. м) |
| 3 | **Административное помещение** (административное помещение), общ. пл. 195,9 кв. м, инв. № 500/D-708137632, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Ложинская, 16-426 |
| | **Начальная цена (с НДС)* – 215 490 долл. США.** (1 100 долл. США за 1 кв. м) |

Шаг торгов – 2 % от текущей цены лота.

*__Примечание:__ цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона)

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях (BYN) по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **1 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Извещение о предыдущих электронных торгах по лотам №№ 1–2 опубликовано в газете «Звязда» 13.07.2022 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 17.10.2022 г. с 11.00 до 13.00 по лотам №№ 1–2 и 01.11.2022 г. с 11.00 до 13.00 по лоту № 3.**

Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема документов:** заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по **14.10.2022 до 17.00. по лотам №№ 1–2 и по 31.10.2022 г. до 17.00 по лоту № 3**

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06 E-mail: info@ipmtorgi.by** |

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № **2022.Ч.002.00111** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Витебский приборостроительный завод», 210026 г. Витебск, ул. Гагарина, 4, тел. 8 (0212) 36-27-07.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 01.11.2022 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 200/С-42904 площадью 760,4 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, д. 4, наименование – здание РСУ, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, составные части и принадлежности: навес, две холодные пристройки, находящееся земельном участке с кадастровым номером 240100000001000497 площадью 3,9964 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4 (общая долевая аренда), целевое назначение – зем. участок для обслуживания административно-производственных зданий и сооружений трубопроводного транспорта.

**Нач. цена: 224 000,00** бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 22400,00 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 31.10.2022. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия электронных торгов:** Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки и независимой экспертизы достоверности внутренней оценки, оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 11 (одиннадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов, оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета электронных торгов. *Расходы Продавца на проведение независимой оценки и на проведение независимой экспертизы внутренней оценки по лоту №1 составляют 638,64 бел. руб. с НДС.* С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни с 10.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Позняк Светлана Георгиевна, +375 (33) 317 50 00.

---

УНП 600023836

## Информация о проведении открытого аукциона 31 октября 2022 г. по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в дер. Избицкое, дер. Трубичино

***Организатор аукциона: Усяжский сельский исполнительный комитет, 222212, пос. Усяж, ул. Комсомольская, д. 10***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь, *(га)* | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка *(бел. руб.)* |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | дер. Избицкое, ул. Посёлочная (объект № 100/2021) | 624885602801000168 | 0,1413 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 15 000 |
| 2 | дер. Трубичино, ул. Центральная (объект № 121/2021) | 624885602801000169 | 0,15 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 10 000 |

Аукцион состоится **31 октября 2022 г. в 11.00** в Усяжском сельском исполнительном комитете по адресу: ***пос. Усяж, ул. Комсомольская, д. 10***, кабинет председателя.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by, http://rlt.by/ru, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by, на сайте Минского областного исполнительного комитета.

У сезон

# ДАЛЕЙ АД ДЭПРЭСІІ

## Як пачаць бегаць трушком?

**Для скандынаўскай хады патрэбныя палкі. Для велапрагулак — адпаведна, ровар. Для сілавых трэніровак — абанемент у трэнажорную залу. Для бегу трушком не трэба нічога — дастаткова выйсці з пад'езда, і вось ты ўжо на трэніроўцы.**

Менавіта таму прабежкі, напэўна, спрабавалі ўсе, хто час ад часу задумваецца аб сваёй фізічнай форме. Але далёка не ўсе здольныя пасябраваць з бегам на доўгія гады...

### АБ «ЛЯНІВЫМ МОЗГУ»

Выбіраючы паміж кубачкам духмянай кавы з пончыкам, катом пад бокам, серыялам на экране смартфона з аднаго боку і бадзёрай ранішняй або вячэрняй прабежкай з другога, хутчэй за ўсё, дзевяць з дзесяці аддадуць свой голас за першы варыянт. Псіхолагі кажуць, што менавіта так, на жаль, працуе наш мозг.

Рашэнні, якія прадугледжваюць магчымасць атрымаць узнагароду неадкладна, задзейнічаюць вобласці мозгу, звязаныя з эмоцыямі. У той жа час выбар адтэрмінаванага станоўчага эфекту (у працівагу неадкладнаму задавальненню) прымушае мозг актывізаваць сістэмы, звязаныя з абстрактным мысленнем. Як паказваюць нейрафізіялагічныя даследаванні, станоўчыя эмоцыі падтрымліваюць менавіта варыянты «хуткай выгады». Больш за тое, даследчыкі адзначаюць, што чалавечы мозг наогул не любіць прымаць падобныя рашэнні — выбар паміж тым прыемным, што можна атрымаць цяпер, і абстрактнай карысцю ў будучыні патрабуе сур'ёзных энергавыдаткаў. Між тым мозг запраграмаваны на эканомію энергіі і імкнецца як мага хутчэй прыняць найбольш відавочнае на дадзены момант, простае рашэнне (кава і серыял) і, што называецца, «закрыць тэму».

**«Найлепшы час для прабежкі — любы вольны ад працы і іншых важных спраў. Бегаць можна і раніцай, і днём, і нават вечарам. Займацца трэба рэгулярна, з пэўнай перыядычнасцю: пажадана — тры разы ў тыдзень».**

І ўсё ж выбар на карысць таго, каб надзець красоўкі і выйсці з дому, варта зрабіць не толькі зыходзячы з вельмі правільных меркаванняў аздараўлення, умацавання імунітэту і страты лішніх кілаграмаў — выгод, якія будуць дасягнуты (а ці будуць?) праз месяц-два рэгулярных прабежак. Хуткае ўзнагароджанне мяркуецца і ў гэтым выпадку. Гаворка — пра так званую эйфарыю бегуна: стан псіхалагічнага ўздыму ў выніку працяглай, не вельмі інтэнсіўнай фізічнай нагрузкі. Чалавек адчувае сябе больш шчаслівым, спакойным, пачынае лепш разважаць і гатовы да вырашэння праблем, якія да прабежкі здаваліся невырашальнымі. Адсюль выказванні аматараў бегу пра тое, што яны выходзяць на прабежку, каб «разгрузіць галаву», упарадкаваць думкі і «перазапусціць мозг». Але дасягнуць гэтага стану атрымаецца, калі не здзяйсняць тыповых памылак пачаткоўцаў, якія прымушаюць многіх сцвярджаць: «Бег — цяжка, сумна, непрыемна і ўвогуле гэта зусім не маё».

### ШТО НЕ ТАК?

Такім чынам, самыя тыповыя памылкі тых, хто вырашыў пачаць бегаць пасля многіх гадоў гіпадынаміі.

● **Рывок са старту**

Сучасны чалавек не жадае чакаць: усе мы любім атрымліваць вынік адразу. Гэтаму нас навучылі сучасныя тэхналогіі. Акрамя таго, з дзяцінства мы памятаем: каб чагосьці дасягнуць, трэба шмат працаваць, наблізіючы мэту. Гэтаму нас вучылі бацькі. Але з бегам гэта не працуе. Наш арганізм аддае перавагу эвалюцыі замест рэвалюцыі. Пачаткоўцы ж пачынаюць бегаць адразу шмат і хутка. Адсюль — непазбежнае зніжэнне матывацыі, нарастанне стомленасці і траўмаў. Пачынаць варта паступова, адзначаюць прафесійныя спартсмены. А бегаць — не кожны дзень. Арганізму патрэбны час для аднаўлення. Асобна скажам аб хуткасці бегу. Прафесійныя трэнеры выступаюць за неабходнасць закласці базу для павольнага бегу, перш чым напрацоўваць хуткасць.

● **Нежаданне слухаць свой арганізм**

«Боль у суставах і звязках? Нічога, пройдзе!» Гэта няправільны падыход, які вядзе да траўмаў і праблем са здароўем, часам незваротных.

● **Адсутнасць рэгулярнасці**

Калі барацьба з «лянівым» арганізмам ідзе з пераменным поспехам (то сіла волі бярэ верх, то лянота) — нерэгулярныя прабежкі не прывядуць да аздараўлення. Нагрузкі павінны быць рэгулярнымі, а іх інтэнсіўнасць — узрастаць вельмі паступова. А паміж імі, паўторым, павінны быць паўзы для аднаўлення.

● **Няўменне... дыхаць**

Часта пачатковец дыхае падчас бегу толькі праз нос або толькі праз рот. У абодвух выпадках арганізм не атрымлівае дастаткова кіслароду. Недахоп кіслароду прыводзіць да рэзкага павышэння пульсу, скаванасці рухаў і псіхалагічнага дыскамфорту. Дыхаць трэба натуральна — як пры хадзе, задзейнічаючы і нос, і рот.

● **Напрамак погляду**

Калі блукаць позіркам з кропкі на кропку, круціць галавой і «захапляцца наваколлем», цалкам рэальна спатыкнуцца, а то і ўрэзацца ў дрэва або чалавека, які ідзе насустрач. Гледзячы толькі пад ногі, бягун перанапружвае шыю. Глядзець падчас бегу рэкамендуецца непасрэдна перад сабой, крыху вышэй лініі гарызонту — метраў на 10 наперад.

● **Гаджэты**

Музыка адцягвае ўвагу ад бегу, сцвярджаюць многія трэнеры. Іншыя кажуць, што правільна падабраная музыка не пашкодзіць. Але, зразумела, лепш, калі на першых трэніроўках уся ўвага накіравана на бег і ваша самаадчуванне. Калі вы не здольныя пражыць без тэлефона нават паўгадзіны, выкарыстоўвайце спецыяльныя спартыўныя чахол на руку ці на адзенне. Галоўнае — не трымайце тэлефон у руцэ, гэта стане прычынай напружання, якое справакуе боль у баку.

### НА СТАРТ!

Пра тое, як пачаць бегаць правільна, мы спыталі ў Алены Цухло, беларускай лёгкаатлеткі і спецыяліста па бегу на доўгія дыстанцыі і марафону. Алена Васільеўна — пераможца шэрагу буйных міжнародных стартаў, майстар спорту міжнароднага класа і старшы выкладчык кафедры лёгкай атлетыкі БДУФК. Вось што яна раіць тым, хто вырашыў заняцца бегам.

***— Алена Васільеўна, бегаць лепш раніцай або па вечарах? І колькі разоў у тыдзень?***

— Найлепшы час для прабежкі — любы вольны ад працы і іншых важных спраў. Бегаць можна і раніцай, і днём, і нават вечарам. Займацца трэба рэгулярна, з пэўнай перыядычнасцю: пажадана — тры разы ў тыдзень. У дні, свабодныя ад бегу, можна падключыць басейн, саўну, зімой — лыжы, практыкаванні на розныя групы мышцаў. Гэта дапаможа ўмацаваць апорна-рухальны апарат, і тады бегавыя прабежкі будуць прыносіць задавальненне і камфорт.



**Гаворка — пра так званую эйфарыю бегуна: стан псіхалагічнага ўздыму ў выніку працяглай, не вельмі інтэнсіўнай фізічнай нагрузкі. Чалавек адчувае сябе больш шчаслівым, спакойным, пачынае лепш разважаць і гатовы да вырашэння праблем.**

***— Ці можна прымаць ежу перад прабежкай?***

— Бегаць на пусты страўнік не варта. Але важна, каб ежа была лёгказасваяльнай. На сняданак перад прабежкай, напрыклад, можна выпіць кубачак чаю, з'есці кавалак белага хлеба і палову банана. Можна прыгатаваць аўсяную кашу. Калі бегаць днём або вечарам, то пасля прыёму ежы павінна прайсці дзесьці 2,5 гадзіны. Кожны бягун метадам спроб ўсталёўвае для сабе час прыёму ежы, яе колькасць і інтэрвалы паміж трапезамі.

***— Якія мэты звычайна пераследуюць пачаткоўцы? З таго, што прыходзіць у галаву першым, — палепшыць самаадчуванне і фізічную форму; скінуць лішнюю вагу; адцягнуцца ад паўсядзённай мітусні. І нават новыя знаёмствы, калі мы гаворым аб трэніроўках у бегавых клубах... Але якія з гэтых мэт змогуць доўга матываваць, напрыклад, офіснага работніка сярэдніх гадоў?***

— Усё, што вы пералічылі, можна назваць правільнымі матывамі. Калі трэніравацца рэгулярна, выконваць рэжым, правільна харчавацца, усе гэтыя мэты цалкам дасягальныя. Асобна спынюся на тым, ці можна схуднець з дапамогай бегу. Нагрузка пры бегу — не адзіная ўмова страты лішніх кілаграмаў. Каб губляць вагу, неабходна дамагчыся дэфіцыту калорый (гэта значыць затрачваць больш, чым атрымлівае арганізм), абавязкова — высыпацца і выконваць правільную трэніровачную праграму. Калі вы пачынаеце бегаць, арганізм затрачвае больш энергіі, чым ён прывык, і, адпаведна, паскараецца метабалізм. Кілаграмы сыходзяць. Але паступова ваш арганізм адаптуецца да нагрузак, і вага перастае зніжацца. Таму важна паступова і разумна павялічваць дыстанцыю і хуткасць.

***— З якімі галоўнымі праблемамі сутыкаюцца пачаткоўцы: недахоп матывацыі, адсутнасць хуткага выніку, «бегаць сумна»?***

— Так, бег — гэта не аэробіка пад музыку і не танцы, а досыць манатоннае дзеянне, але менавіта гэтая яго асаблівасць мае плюсы. Ці часта сучасны чалавек можа пабыць сам-насам з сабой? Палюбавацца прыродай? Спакойна паразважаць аб жыцці або нават проста ні аб чым не думаць? Тым больш у бегавых клубах, напрыклад, прабежкі праводзяцца ў лясах, парках, па прыгожых палях. Можна пабудаваць маршрут і самастойна — так, каб ён вам падабаўся. Гэта вельмі добра ўплывае на псіхіку.

***— Што рабіць, калі прабежка суправаджаецца адышкай? Калі задыхаешся, калі баліць бок?***

— Пры пачатковых занятках бегам могуць быць розныя не вельмі прыемныя адчуванні ў арганізме, болі ў мышцах. Але пры правільных рэгулярных занятках бягун будзе пачувацца ўсё лепш

**«Асобна скажам аб хуткасці бегу. Прафесійныя трэнеры выступаюць за неабходнасць закласці базу для павольнага бегу, перш чым напрацоўваць хуткасць».**

і лепш. Калі падчас бегу адчуваеце сябе не вельмі добра, можна чаргаваць бег і хаду. Асабліва важна так рабіць на пачатковым этапе заняткаў бегам. Дыхаць важна так, каб падчас бегу вы без задышкі маглі прамаўляць сказы. Не можаце — зменшыце тэмп. Гэтым добрыя заняткі ў групе — ёсць з кім перакінуцца парай-тройкай фраз падчас прабежкі. І ў цэлым я раіла б хоць бы на першых этапах займацца бегам менавіта ў групе, з прафесійным трэнерам. Хоць не ўсім такое падыходзіць, бо ў гэтым выпадку трэба падладжвацца пад графік трэніровак.

***— Як прымусіць сябе выйсці на прабежку?***

— Прымусіць кагосьці (у тым ліку самога сябе) займацца бегам немагчыма. Можна толькі захапіць. Самае галоўнае — разумець, што хуткага эфекту чакаць не варта. Тут трэба рабіць акцэнт не на вынік, а на працэс. Пачынаць пажадана з прагулак, а затым — чаргаваць бег і хаду. Лепш за ўсё бегаць у лесе (зямля больш фізіялагічная для нашай ступні, чым асфальт і тратуарная плітка). Але калі магчымасці часта выязджаць на прыроду ў вас няма, добрых вынікаў можна дамагчыся, бегаючы і ў горадзе. Хоць у гэтым выпадку на першы план выходзіць пытанне правільнага бегавога абутку — з добрай падэшвай і супінатарам. А ў цэлым адзенне і абутак павінны быць зручнымі і не дастаўляць дыскамфорту. Яшчэ часта пытаюцца, ці можна піць падчас бегу. Можна, а ў спякоту — неабходна. Але гэта павінна быць простая негазаваная вада (або спартыўныя напой). І самае галоўнае. Падчас бегу ўключаецца ў работу ўвесь арганізм. Таму, перш чым заняцца бегам (асабліва калі вам не 12 гадоў і нават не 25), неабходна прайсці медагляд і атрымаць рэкамендацыі ўрача. На прабежках важна сачыць за самаадчуваннем (што называецца, слухаць арганізм) і ў ідэале рэгулярна вымяраць пульс.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# РЭБРЫШЧА ПАЛІЛІ ДВОЙЧЫ



**Вёска Рэбрышча знаходзіцца прыкладна за пяць кіламетраў на захад ад вёскі Чудзенічы, якая стаіць на старой шашы Астрашыцкі Гарадок — Лагойск. У гады Вялікай Айчыннай вайны тут пачыналася партызанская зона, і немцы заходзілі сюды звычайна толькі падчас карных аперацый супраць партызан. Трагедыя ў Рэбрышчы здарылася 3 ліпеня 1943 года...**

Незадоўга да гэтага завяршылася карная аперацыя «Котбус», якая працягвалася цэлы месяц. Нацыстам не ўдалося знішчыць партызан каля возера Палік, як планавалася. Народныя мсціўцы змаглі з мінімальнымі стратамі выйсці з акружэння і зноў сталі праводзіць дыверсіі на дарогах. Асобы батальён Дырлевангера вярнуўся на месца дыслакацыі ў Лагойск і заняўся сваёй звыклай справай — знішчэннем вёсак разам з людзьмі. Кожны дзень эсэсаўцы з асобага батальёна выязджалі ў баявы дазор або, як яны гэта называлі, «штрайф» (*ням.* Streif): патрулявалі дарогі і спальвалі асобныя населеныя пункты каля Лагойска. Гэта былі лакальныя акцыі фашыстаў, загад на іх правядзенне не выяўлены.

У канцы чэрвеня 1943 года разам з жыхарамі былі спалены шматлікія лагойскія вёскі: 22 чэрвеня — Аўгустова, 23 чэрвеня — Ніўкі і Баравыя, 25 чэрвеня — Кандратавічы і Мошчанка, 27 чэрвеня — Кузевічы і Дабрэнява, 28 чэрвеня — Мішкавічы, 29 чэрвеня — Старынкі, Сілічы, Лабуншчына, пасёлак Чудзенічы і хутар Шавейшчына. Сваю крывавую працу нацысты выконвалі без адпачынку. Не паспелі патухнуць пажары ад спаленых падчас гэтай карнай аперацыі хат, як немцы пачалі новую акцыю каля Лагойска.

## АПЕРАЦЫЯ «ГЮНТЭР»

Карная аперацыя пад кодавай назвай «Гюнтэр» праводзілася з 2 да 7 ліпеня 1943 года. Яна ахапіла Мінскі, Валожынскі і Лагойскі раёны. Удзел у ёй прымалі 2-і паліцэйскі полк Грыпа, пяхотны полк пад камандаваннем фон Гольца, батальён СС Дырлевангера і 11-ы матарызаваны ўзвод жандармерыі. Асаблівую ўвагу акупанты надавалі прачэсванню лясных масіваў Рудня і Манылы — там знаходзіліся базы партызанскіх атрадаў. Разам з тым немцы забіралі ў насельніцтва скаціну, збожжа, прадукты харчавання, а таксама вывозілі людзей у рабства ў Германію.

Падчас аперацыі «Гюнтэр» карнікі прачэсвалі месцы меркаванага знаходжання партызанскіх лагераў. Народныя мсціўцы ўмела сыходзілі з-пад удараў карнікаў, а мірныя жыхары ратаваліся ў лясах і балотах, але не ва ўсіх гэта атрымлівася — у многіх сем'ях выхоўваліся малыя дзеці, шмат было хворых і нямоглых: яны не маглі сысці разам з усімі і заставаліся ў вёсках у надзеі на літасць карнікаў. Толькі тыя не шкадавалі ні старых, ні дзяцей — забівалі і спальвалі ўсіх, хто трапляў на вочы. Гэтая невялікая па часе і ахопе тэрыторыі карная аперацыя, як і ўсе папярэднія, пакінула пасля сябе папялішчы на месцы спаленых вёсак і чорныя галавешкі ад хат. Такі лёс напаткаў і лагойскую вёску Рэбрышча.

## УЦЯКЛІ Ў ЛЕС

Да вайны з Рэбрышча ішла прамая дарога па лесе на вёску Гайна. Яе і перакрылі партызаны, спілаваўшы дрэвы і паваліўшы іх на дарогу. Гэта ўзлавала і на нейкі час затрымала карнікаў, а тым часам большасць жыхароў паспела ўцячы з вёскі, але не ўсе — пакінутых чакала жудасная доля. Аднавіць падзеі таго дня дапамаглі тыя, хто цудам застаўся ў жывых.

З успамінаў жыхаркі Рэбрышча Марыі Канстанцінаўны Качан: *«Падчас вайны мы з мамай жылі недалека ад Рэбрышча ў вёсцы Весніно. У Весніно выганялі ўсіх людзей на выган, але нікога тады не забілі. Пагражалі, што за сувязь с партызанамі будуць расстрэльваць. Патрымалі людзей і адпусцілі. Мая мама, Муравіцкая Вера Іванаўна, была ў партызан сувязной, шыла ім адзежу. Яе арыштавалі ў Лагойску, калі яна паехала мяняць пашпарт. Паліцаі пазналі маму і выдалі немцам, указаўшы, што яна звязаная з партызанамі. Мамінага брата Хведара таксама арыштавалі. Казалі, што іх пасадзілі ў машыну і павезлі пад Малінаўку, у роў, там і расстралялі. Дзядуля наш хадзіў уначы туды, раскопваў магілы — знайшоў свайго сына і мужа сястры, а маму не знайшоў. Нас прывезлі ў Рэбрышча да сям'і Мурашка — яны нашы далёкія сваякі, у іх сваіх дзяцей не было. У вёсцы людзей мала было — баяліся. Большасць знаходзілася ў лесе: і днявалі, і начавалі там».*



Помнік спаленым жыхарам вёскі Рэбрышча.

**У канцы чэрвеня 1943 года разам з жыхарамі былі спалены шматлікія лагойскія вёскі: 22 чэрвеня — Аўгустова, 23 чэрвеня — Ніўкі і Баравыя, 25 чэрвеня — Кандратавічы і Мошчанка, 27 чэрвеня — Кузевічы і Дабрэнява, 28 чэрвеня — Мішкавічы, 29 чэрвеня — Старынкі, Сілічы, Лабуншчына, пасёлак Чудзенічы і хутар Шавейшчына.**

У адзін з дзён у Рэбрышча прыйшлі карнікі. Жыхары вёскі маглі іх не ўбачыць, аднак акупанты падпалілі па дарозе свінарнік, які знаходзіўся каля лесу. Ён загарэўся, вяскоўцы, хто мог, уцяклі ў лес. Марыя Качан разам са сваякамі таксама. Вось што яна расказвала: *«Мы далёка ў лес уцяклі, а там дзядзькавы стрыечныя сёстры лазілі на дрэвы. Крысціна Муравіцкая — дэпутатам была, працавала на трактары — залезла на хвойку і кажа: «Ужо нашы хаты гарэць». Гэта было каля абеду. Людзі ўцяклі хто куды. Тых, хто застаўся, сагналі ў хату Пятра Качана і спалілі. Яны не ўцяклі, бо не паверылі, што будуць паліць, таму і засталіся ў сваіх хатах. У Васілеўскіх спалілі маці, цётку і дзяцей. Ад вёскі засталіся адны галавешкі. Родзічы пахавалі загінулых. Калі спалілі Рэбрышча, то мы ў Тукалаўцы ў дзядзькавай сястры жылі. У апошнюю блакаду, перад вызваленнем, дзядзька Барыс Мурашка выкапаў яму на полі, нас туды пасадзіў, дошкамі закрыў і засыпаў зямлёй. Поле над нашым сховішчам узараў і забаранаваў. Сядзелі там, душна было, цётка палачкай працыкала зямлю, каб дыхаць было чым. Цэлую ноч сядзелі, чулі як немцы гергеталі, але наша месца не заўважылі. Так мы і засталіся жывыя».*



Жыхарка Рэбрышча Марыя Качан, якая змагла пазбегнуць расправы карнікаў.

Мяркуючы па гэтых ўспамінах, падпольшчыкаў з Весніно расстралялі ў красавіку 1943 года — менавіта тады немцы мянялі пашпарты ў Лагойску. А месца іх пахавання знаходзіцца ў пяшчаным кар'еры ўрочышча Іванаўшчына. У гэтым месцы 30 жніўня 1941 года нацысты расстралялі яўрэйскае насельніцтва Лагойска і мястэчка Гайна, а потым на працягу ўсіх гадоў акупацыі расстрэльвалі партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў раёна. Зараз там стаіць помнік ахвярам генацыду. 30 жніўня 2022 года на месцы расстрэлу мясцовых жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці прайшла цырымонія перапахавання астанкаў больш чым тысячы ахвяр. Аб месцы жудаснай трагедыі сведчыць памятны знак.



## СПАЛІЛІ ЎСІХ, ХТО ЗАСТАЎСЯ Ў ВЁСЦЫ

Засталася ў жывых і жыхарка Рэбрышча Вера Мітрафанаўна Качан (Сарока). Той жудасны дзень, калі не стала яе вёскі, жанчына памятала да апошняга. Запісана з яе слоў: *«Як палілі нашу вёску, то паўцякалі ўсе, а хто з людзей застаўся, усіх спалілі. Немцы ішлі па вёсцы, заходзілі ў хаты. У каго з жыхароў былі дзеці ў Германіі, то яны клалі фотакарткі на стол: гэтым самым паказвалі немцам, што дзеці служаць ім, але яны ўсё роўна іх забівалі. Нічога не дапамагло — спалілі ўсіх, хто быў у вёсцы. Я ўцякла з братам, нас там шмат было. Мы прыбеглі ў Кандратавічы, ляжалі там на могілках, а потым пайшлі ў Прудзішча — там быў партызанскі раён».*

Яшчэ адзін сведка гэтай трагедыі — жыхар Рэбрышча Мікалай Мітрафанавіч Сарока — расказаў наступнае: *«З нашай вуліцы ўсе ратаваліся, мама мая таксама. Пачалі ўцякаць, як убачылі, што запалілі свінаферму. Мы пасвілі кароў у полі пад Кандратавічамі. Прыбег Касоўскі і сказаў: «Хлопцы, за мной». Мы прыйшлі да моста і паселі ў рове. Мы бачылі і чулі, як людзі крычалі. Каровы былі з намі ў гэтым рове — як усё адчувала скаціна. Ноч халодная была, так я да каровы прытуліўся і заснуў. Раніцай маці па нас прыйшла: яна ў бярэзніку, за гарой, сядзела. Усё спаленае было ў Рэбрышчы. Вёску не акружалі: ішлі па вуліцы і палілі. Чуткі пайшлі, што ў каго дзеці ў Германіі, таго чапаць не будуць. Гэта спецыяльна зрабілі, каб людзі былі дома...»*

У кожнага жыхара Рэбрышча — свая гісторыя выратавання. Аб тым, як атрымалася выжыць у той страшны дзень, расказала Зінаіда Фёдараўна Кручонак: *«Мы жылі каля лесу. Многія ўцяклі. У сваёй хаце засталася маміна цётка, бабуліна сястра. Яна была ўпэўнена, што хаты не будуць паліць. Дарэмна... Мама наша таксама хацела застацца ў хаце: думала, што, можа, дзяцей малых пашкадуюць. Добра, што сёстры яе адгаварылі, сказалі забіраць дзяцей і ісці за імі — жыццё даражэй. Так яно і выйшла».*

## УМЯШАЛІСЯ ПАРТЫЗАНЫ

У партызанскіх мемуарах таксама засталіся ўспаміны аб гэтай карнай акцыі. У той час каля лагойскіх вёсак Бабры, Стайкі, Янушкавічы базіраваліся шматлікія разведгрупы, якія збіралі разведданыя аб варожых войсках у Мінску. Разведчыкі са спецгруппы ЦШПР маёра Сцяпана Казанцава, якая дыслацыравалася каля вёскі Сярпішчына Лагойскага раена, вярталіся акурат з задання. Да лагера дайсці не паспелі. Разведчык Хведар Соманаў успамінаў: *«Калі злева ад нас, у раёне вёскі Прыселкі, пачулася аўтаматная перапалка, а справа гітлераўцы падпалілі вёску Рэбрышча, у невялікім перелеску, дзе мы знаходзіліся, сабралася многа людзей — не толькі з гэтых, але і з іншых навакольных населеных пунктаў. Людзі сцішыліся, не рухаліся, не размаўлялі, каб нічым не выдаць сябе. І ўсё ж фашысты адкрылі па нашым лесе кулямётны агонь. Ад страху, ад жаху закрычалі дзеці, замітусіліся жанчыны, ва ўсю моц зараўлі параненыя каровы. Здавалася, выратавання нікому не будзе: ці многа часу трэба, каб прыйсці сюды і дабіць усіх да адзінага? Але гэтага часу, гэтых паўтара-двух дзясяткаў хвілін, хапіла, каб тыя з нас, у каго была зброя, па маёй камандзе змаглі дабегчы да ўзлеску, бліжэй да палаючай вёскі Рэбрышча, і адтуль адкрыць агонь па бакавой ахове карнага атрада, а значыць, выклікаць агонь на сябе. Не зразумеўшы, што адбываецца, у перастрэлку адразу ўвязаліся іншыя варожыя падраздзяленні. Сляпы агонь, як нярэдка бывала, распаўсюджваўся направа і налева, узмацняўся, рос. А жыхары, сабраныя ў пралеску, скарыстаўшыся гэтым, развярнулі коней і памчаліся ў процілеглы бок, у лясны масіў, напярэдадні з канца ў канец прачэсаны карнікамі...»* Атрымліваецца, партызаны, якія выпадкова тут апынуліся, своечасова адцягнулі ўвагу карнікаў і далі магчымасць людзям уцячы.



Мікалай Сарока — яшчэ адзін сведка трагедыі.

## ДАКУМЕНТЫ АБВІНАВАЧВАЮЦЬ

У Нацыянальным архіве захаваліся дакументы аб спаленні вёскі Рэбрышча. Так атрымалася, што ў гады вайны яе палілі двойчы — спачатку саму вёску, а потым шалашы, у якіх хаваліся мясцовыя жыхары. З пратакола допыту сведкі Васілеўскага Іосіфа Іванавіча: *«... У нашай вёсцы немцы не стаялі, па даносе здраднікаў яны прыбылі з Лагойска, Гайны і Астрашыцкага Гарадка. Адначасова чалавек каля пяцісот немцаў акружылі вёску і пачалі яе паліць з усіх бакоў. Былі спалены 62 жылыя хаты з падворнымі пабудовамі і асабістай маёмасцю жыхароў. Пасля пажару засталіся толькі 3 хаты. Пры пажары насельніцтва спрабавала абараніць пабудовы ад агню, але немцы іх расстрэльвалі, кідалі ў агонь жывымі, не лічачыся нават з грудным дзіцем. У адну адрыну немцы сагналі дваццаць аднаго чалавека — старых і жанчын з груднымі дзеткамі. Расстралялі, а потым спалілі. Сярод спаленых былі:*

*1. Васілеўская Ганна, 51 год (мая жонка).*

*2. Васілеўская Вольга, 40 гадоў, са сваім сямімесячным сынам.*

*3. Качан Сцяпан, 57 гадоў.*

*4. Тэлецкая Надзея, 40 гадоў, з чатырма дзецьмі ад чатырох да 10 гадоў.*

*5. Качан Наталля, 60 гадоў.*

*6. Кручонак Надзея, 39 гадоў, з трыма дзецьмі ад трох да дзевяці гадоў.*

*7. Кручонак Настасся, 17 гадоў.*

*8. Касоўскі Міхась, 48 гадоў, са сваім дзевяцігадовым сынам, якога расстралялі пры спробе ўцячы.*

*9. Сарока Юрый, 65 гадоў.*

*10. Тылецкі Пётр, 35 гадоў.*

*11. Качан Кастусь, 61 год.*

*Пасля расправы з мірнымі жыхарамі немцы сагналі з вёскі пяць кароў, двух коней і з'ехалі. Другі раз карнікі напалі на Рэбрышча праз адзін-два месяцы. Жыхары, якія ўцалелі падчас першай карнай акцыі гітлераўцаў, туліліся ў шалашах. Траіх жанчын выцягнулі з шалашоў і расстралялі. Сярод іх былі Марыя Макейчык (65 гадоў) і Тадора Макейчык (50 гадоў), а таксама мясцовая жыхарка па прозвішчы Міхаль (45 гадоў). Усе пабудовы, якія былі на месцы ўжо спаленай вёскі, знішчылі. Аднак пасля вайны населены пункт здолеў адрадзіцца, паўстаць з попелу».*

**Падчас аперацыі «Гюнтэр» карнікі прачэсвалі месцы меркаванага знаходжання партызанскіх лагераў. Народныя мсціўцы ўмела сыходзілі з-пад удараў карнікаў, а мірныя жыхары ратаваліся ў лясах і балотах, але не ва ўсіх гэта атрымлівася — у многіх сем'ях выхоўваліся малыя дзеці, шмат было хворых і нямоглых: яны не маглі сысці разам з усімі і заставаліся ў вёсках у надзеі на літасць карнікаў. Толькі тыя не шкадавалі ні старых, ні дзяцей — забівалі і спальвалі ўсіх, хто трапляў на вочы. Гэтая невялікая па часе і ахопе тэрыторыі карная аперацыя, як і ўсе папярэднія, пакінула пасля сябе папялішчы на месцы спаленых вёсак і чорныя галавешкі ад хат.**

Пасля вайны ў памяць аб загінулых аднавяскоўцах у Рэбрышчы ўстанавілі помнік. Ён стаіць на ўскрайку вёскі — у тым жа месцы, дзе спалілі жыхароў. Побач — помнік двум чырвонаармейцам, якія загінулі ў Рэбрышчы падчас вайны. Іх пахавалі мясцовыя жыхары. Імёнаў вайскоўцаў яны не ведалі, але пахаванне даглядалі. Дагэтуль чырвонаармейцы застаюцца невядомымі салдатамі.

Сёння ўсё менш застаецца сведак тых трагічных падзей, але памяць народная жыве. Тыя, каму пашчасціла выжыць, са слязамі на вачах успамінаюць ваеннае ліхалецце і не перастаюць паўтараць: «Людзі, не дапусціце вайны!» Яны ведаюць, што гэта такое, таму жадаюць для сваіх дзяцей і ўнукаў, для ўсіх беларусаў, жыць на сваёй зямлі пад мірным небам.

**Аляксандр ПАЎЛЮКОВІЧ, фота аўтара і з адкрытых крыніц.**

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*



Карнікі.

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 17 октября 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| Капитальное строение с инв. номером 630/С-47149 общей площадью 647,0 кв. м (наименование – административное здание; назначение – здание административно-хозяйственное; составные части и принадлежности: бетонный подвал); капитальное строение с инв. номером 630/С-47154 общей площадью 397,2 кв. м (наименование – склад материальный; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47152 общей площадью 222,7 кв. м (наименование – склад для горюче-смазочных материалов; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47155 общей площадью 743,1 кв. м (наименование – боксы для автомашин с пристройкой подсобных помещений; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47160 общей площадью 1960,9 кв. м (наименование – ремонтные мастерские; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47158 общей площадью 1360,7 кв. м (наименование – пристройка к реммастерским; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47156 общей площадью 1123,1 кв. м (наименование – боксы для автомашин; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-55558 общей площадью 35,0 кв. м (наименование – навес под баллоны; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-55622 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из силикатного кирпича (1,95 м х 2,34 м х 0,25 м), площадью 4,6 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55620 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из металлической арматуры (21,0 м х 2,69 м), площадью 56,5 кв. м, на металлических столбах (0,1 м х 2,60 м)); капитальное строение с инв. номером 630/С-55611 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1.1. – ограждение из силикатного кирпича (13,94 м х 2,85 м х 0,25 м), 39,7 кв. м, а1.2. – ворота металлические (4,07 м х 2,85 м)); капитальное строение с инв. номером 630/С-55610 (наименование – ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение бетонное (97,5 м х 1,71 м), 166,7 кв. м с 31 кирпичными столбиками с бетонными оголовками; а.1.1. – металлическая решетка (1,50 м х 1,97 м), 41,37 кв. м; а2 – ворота металлические (5,96 м х 3,70 м), 22,1 кв. м; а2.1. – калитка металлическая (1,62 м х 2,30 м), 3,73 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55608 общей площадью 7260,0 кв. м (наименование – площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из асфальтобетона); капитальное строение с инв. номером 630/С-55607 общей площадью 465,0 кв. м (наименование – площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из бетонной плитки); оборудование котельной с инв. номером 146 (котел КВЖ-02, 2 шт.; циркуляционный насос, 4 шт.; бойлер 10 м. куб., 1 шт.; топливопровод 20 м; щит управления) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,331 га, кадастровый номер – 642000000002000230 |
| Местонахождение: Минская область, Минский район, г. Молодечно, ул. Замковая, 33 |
| Начальная цена: 1 363 662,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 136 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **17 октября 2022 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 03.10.2022 по 14.10.2022 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефонам: (017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

---

Центр Промышленной Оценки
**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Авиакомпания «Белавиа», г. Минск, ул. Немига, 14а** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by** |

| Предмет электронных торгов | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|
| **НЕЖИЛОЕ ПОМЕЩЕНИЕ** (помещение неустановленного назначения), инв. № **130/D-40516**, общ. пл. **58,1** кв. м, по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Брестская, д. 5, пом. 1. Обременение: аренда. Шаг аукциона: **5 %** от текущей цены | **68 880,00 бел. руб.** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет **BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000** в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 рабочих дней** после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания покупателю

**Условия оплаты предмета электронных торгов.** Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность об иных сроках и порядке оплаты предмета электронных торгов, оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после подписания договора купли-продажи. Срок передачи предмета электронных торгов: 10 календарных дней после поступления цены недвижимого имущества на расчетный счет продавца

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также более подробную информацию о предмете электронных торгов, о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов **затраты** на их проведение и оплатить **вознаграждение 5 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов, продавец имеют право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 13.07.2022 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 13.10.2022 с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **12.10.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Оператор ЭТП** | **«Единая система электронных торгов»** |
| **Продавец** | **Государственное предприятие «Белоруснефть-Транс»** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1:** «Автомобиль SKODA OCTAVIA», инвентарный номер № 002197-н (по бух. учету), год выпуска – 2008, начальная цена – 15 000,00 бел. руб., включая НДС по ставке 20 %.
Местонахождение: Гомельская обл., Мозырский район, промзона Михалки Мозырь-11

**Лот № 2:** «Автомобиль SKODA OCTAVIA», инвентарный номер № 656 (по бух. учету), год выпуска – 2008, начальная цена – 14 000,00 бел. руб., включая НДС по ставке 20 %.
Местонахождение: Гомельская обл., Мозырский район, промзона Михалки Мозырь-11

**Лот № 3:** «Автомобиль VOLKSWAGEN TOUAREG», инвентарный номер № 206391 (по бух. учету), год выпуска – 2008, начальная цена – 25 000,00 бел. руб., включая НДС по ставке 20 %.
Местонахождение: г. Гомель, ул. Проселочная, 16А

**Лот № 4:** «Автомобиль VOLKSWAGEN PASSAT», инвентарный номер № CM1075 (по бух. учету), год выпуска – 2000, начальная цена – 8 000,00 бел. руб., включая НДС по ставке 20 %.
Местонахождение: Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Промышленная, 2

**Лот № 5:** «Автомобиль SKODA OCTAVIA», инвентарный номер № 655 (по бух. учету), год выпуска – 2008, начальная цена – 14 000,00 бел. руб., включая НДС по ставке 20 %.
Местонахождение: Минская обл., г. Фаниполь, ул. Заводская, 9Д

**Лот № 6:** «Автомобиль SKODA OCTAVIA», инвентарный номер № 66662135 (по бух. учету), год выпуска – 2008, начальная цена – 14 000,00 бел. руб., включая НДС по ставке 20 %.
Местонахождение: Минская обл., г. Фаниполь, ул. Заводская, 9Д

**Размер шага составляет 5 %** от начальной цены лота (по всем лотам)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с Республиканского унитарного предприятия «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь», р/с: BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ,УНП: 190318109, ОКПО: 37533622, БИК BELBBY2X

**Срок подписания договора купли-продажи: в течение 20 (двадцати)** календарных дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение электронных торгов, в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «Единая система электронных торгов», по электронному адресу: www.torgi.gov.by**

**Дата и время начала и завершения электронных торгов: с 02.11.2022 с 9.00 до 02.11.2022 16.00**

**Дата и время окончания приема заявок:**
по 31.10.2022 до 16.00 по адресу www.torgi.gov.by

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайте: Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by в разделе «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»**

**Контактные данные:** +375 (17) 200-73- 33, +375 (17) 200- 64-11, +375 (29) 249 56 43 (Продавец)

---

# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **ОАО «Хойникский КБО»** (УНП 400056519) 247622, Гомельская область, г. Хойники, ул. К. Маркса, 28, тел.: +375 232 31-59-72, +375 29 135-78-72.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **31 октября 2022 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов –

## ВОЗДУХОНАГРЕВАТЕЛЬ (ИЭИ-2,4-220), инв. № 7090.

Начальная цена предмета торгов – 60,00 бел. руб. с НДС.
Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.
Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.
**Местонахождение предмета торгов – г. Гомель, ул. Б. Хмельницкого, 77.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 09.00 01.10.2022 г. по 17.00 28.10.2022 г. 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Планар» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

## ЗДАНИЯ ДЕРЕВООБРАБОТКИ

***(составные части и принадлежности: пристройка, забор железобетонный, подъездные дороги, опилкоприемник),***
**инв. № 601/С-26267, общей площадью 478,4 кв. м, расположенного на земельном участке площадью 0,6437 га с кадастровым номером 623288000016000004** ***(право постоянного пользования)*** **по адресу: Минская область, Логойский район, Янушковичский с/с, 8.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **104 000,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **10 400,00 бел. руб.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию в СМИ.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **01.11.2022 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.10.2022** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (8044) 797-93-83.**

УНП 100104937

---

УНП 600014139

## Информация о проведении открытого аукциона 27 октября 2022 г. по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Смолевичи

***Организатор аукциона: Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Смолевичи, ул. В. Быкова, 37 | 624850100008000445 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 28100 |
| 2 | г. Смолевичи, ул. В. Быкова, 15 | 624850100008000321 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 28200 |
| 3 | г. Смолевичи, ул. Огинского, 23 | 624850100008000321 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 28300 |

**Аукцион состоится 27 октября 2022 г. в 15.00 в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125, зал заседаний.**

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: **https://au.nca.by, http://rlt.by/ru,** Смолевичского райисполкома: **isp@smolevichi.gov.by,** на сайте Минского областного исполнительного комитета

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

Слова пісьменніка

# РЭКТАРЫ: урыўкі з кнігі




## БУДАЎНІЧЫЯ КАНСТРУКЦЫІ

У Брэсцкім рэгіёне я прыкіпеў да тэхнічнага ўніверсітэта, найперш з-за яго рэктара — доктара тэхнічных навук, прафесара Пятра Сцяпанавіча Пойты. Як рэктар я больш і часцей сустракаўся з рэктарамі гуманітарных ВНУ, пра тое, што Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут — аўтарытэтная навучальная ўстанова, быў начуты, яго рэктара здалёку назіраў, але пазнаёміцца блізка з ім тады не давялося. Аднак на самым пачатку маёй працы ў міністэрстве Прэзідэнт запланаваў сустрэчу са студэнтамі... Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта, і ўжо па абавязку службы мне давялося прадметна пазнаёміцца з гэтай ВНУ.

У рэктара Пойты ўсё выглядала грунтоўным, як і ён сам. Вучэбныя карпусы, лабараторыі, студэнты, перамяшчэнні па калідорах, размовы — усё было «прыземістым», няспешным, не выпірала, было спакойна-паважлівым і прыцягальным, усё ў адпаведнасці з абліччам самога Пятра Сцяпанавіча. Гэтую «прыземленасць», дзелавыя абставіны, цікавасць студэнтаў і выкладчыкаў да рэальнага жыцця адчуў, як мне падалося, і Аляксандр Рыгоравіч. Сустрэча са студэнтамі доўжылася чатыры гадзіны, а праляцела як адно імгненне.

Навуковыя даследаванні ў тэхнічных ВНУ ў асноўным прыкладныя, але кожны ўніверсітэт нечым знакаміты. Напрыклад, БНТУ — архітэктурнымі праектамі, Беларуска-расійскі ўніверсітэт — даследаваннямі ў галіне зваркі, а Брэсцкі тэхнічны — сваімі будаўнічымі канструкцыямі для дахаў, заўважым, любых памераў. З якім гонарам Пётр Сцяпанавіч паказваў мне тэарэтычныя распрацоўкі ў чарцяжах, а пасля іх будаўнічую рэалізацыю на велізарным даху летняга амфітэатра ў Віцебску, дзе штогод праходзіць знакаміты на ўвесь свет «Славянскі базар», на лядовых палацах, на прамысловых цэхах. У ажуры гэтых металічных канструкцый відавочна бачны арыгінальная інжынерная думка і грунтоўная трываласць збудавання над галавой, у іх нават прысутнічае мастацкі густ.

Кіраўнік Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта — вельмі паважаны ў гэтым рэгіёне чалавек, як і ўсялякі рэктар, ён палітык. Яго выбранне старшынёю «Белай Русі» Брэсцкай вобласці было заканамерным, і са сваёй камандай ён стварыў адну з найлепшых рэгіянальных арганізацый. Да гэтай працы Пётр Сцяпанавіч адносіўся гэтаксама прадумана і грунтоўна, як і да кіраўніцтва ўніверсітэтам. Ён даскакнала ведаў абставіны ў раённых цэнтрах, грамадскі актыў, мудра задзейнічаў у палітычнай рабоце сваіх выпускнікоў. А маштаб такой працы быў немалы — не толькі ў буйных гарадах, напрыклад, як у Пінску, Баранавічах, але і ў калектывах такіх прадпрыемстваў, як электралямпавы завод, завод газавай апаратуры, «Санта Брэмар». Прарэктары ў Пятра Сцяпанавіча былі такія ж, як і ён, — спакойныя, разважлівыя, а вось намеснік па «Белай Русі», былы ваенкам палкоўнік Васіль Васільевіч Лашч, — поўная ім усім процілегласць. Худы, актыўны нават знешне, рухавы — у «Белай Русі» яго ведалі не меней, чым Пойту. Але з якой жа шчырай павагай ён ставіўся да Пятра Сцяпанавіча! Іх дзелавыя і сяброўскія адносіны так спрыялі справе, што мы часам імі проста ціха любаваліся.

Напрыканцы 2018 года на базе Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта праходзіла абласная справаздачна-выбарчая канферэнцыя «Белай Русі». Перад яе пачаткам у кабінеце рэктара сабраліся ганаровыя госці — кіраўнікі вобласці, дырэктары буйных прадпрыемстваў. Я бачыў, як добра сябе адчуваў у кабінеце Пятра Сцяпанавіча губернатар Брэсцкай вобласці Анатоль Васільевіч Ліс. Нам усім было зразумела, што ва ўніверсітэце ён часты госць, што яму тут камфортна, што рэктар для яго не проста апірышча, а блізкі і надзейны чалавек. Я тады яшчэ раз прадметна ўсвядоміў, якім павінен быць кіраўнік універсітэта.

Адносіны да Пятра Сцяпанавіча як да грамадскага лідара, проста як да чалавека, я яшчэ раз адчуў на ўрачыстым абедзе пасля канферэнцыі. Пры такім настроі, адзінстве людзей можна горы звярнуць. Але ж і ў тым выпадку рэктар Пойта заставаўся нешматслоўным, ад яго сыходзіла нейкая ўнутраная сіла і перакананасць у правільнасці ўжо зробленай працы і візначаных перспектыў.

Пётр Сцяпанавіч і як вучоны, і як кіраўнік сфарміраваўся ў сваім родным універсітэце, выпрабаваў і прайшоў усе яго прыступкі. Сем гадоў працаваў першым прарэктарам, шаснаццаць — рэктарам. Сябе ніколі не шкадаваў, прыхварэў, выраўшыў сысці ў адстаўку. Як дзяржаўны і вельмі адказны за даручаную справу чалавек быў надзвычай здзіўлены, нават абураны, калі падчас прызначэння новага рэктара з ім нават не параіліся. Казаў пры гэтым, што ў такім выпадку не вельмі істотна, падтрымлівае ён кандыдатуру новага рэктара ці не. Бо канчатковае рашэнне ўсё адно не за ім, але няўжо за доўгія гады працы кіраўніком універсітэта не заслужыў, каб у яго хоць бы спыталі, што ён думае з гэтай нагоды. Я цалкам падзяляю пазіцыю рэктара Пойты. І жыццё пацвердзіла яго справядлівасць. Не атрымалася праца ў новага рэктара, ён на пасадзе быў менш чым два гады.

Цяпер Брэсцкі тэхнічны ўніверсітэт узначальвае доктар тэхнічных навук, прафесар Аляксандр Генадзьевіч Бахановіч. Ён закончыў Магілёўскую «машынку» (БРУ), аспірантуру БНТУ і там застаўся працаваць. Што цікава, у БНТУ, працуючы прарэктарам па вучэбнай рабоце, ён узначальваў і пярвічную арганізацыю «Белай Русі». І ён сам, і яго арганізацыя ў горадзе былі вельмі заўважныя. Калі Аляксандр Генадзьевіч атрымаў новае прызначэнне, я яму адразу ж пазваніў і параіў у кіраўніцтве Брэсцкім тэхнічным універсітэтам абапірацца і на вопыт працы Пятра Сцяпанавіча Пойты. Гэта адзін з найлепшых рэктараў, якіх я ведаў.

Рэктар Брэсцкага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Васіль Аляксандравіч Сцепановіч быў мне сімпатычны. Ён кіраваў універсітэтам з 1989 да 1999 года, а я ў гэты час быў прарэктарам па вучэбнай рабоце, пасля першым прарэктарам Магілёўскага ўніверсітэта і па службовых справах часта бываў у Міністэрстве адукацыі. Вось там я і сустракаў Васіля Аляксеевіча. Ён, як і я, сябраваў з начальнікам упраўлення вышэйшай школы Мікалаем Міронавічам Плескацэвічам, у яго ў кабінеце мы ўтрох і «тусаваліся». Абмяркоўвалі не толькі службовыя пытанні. Васіль Аляксеевіч быў вельмі цікавым для мяне суразмоўцам. Ён, як і я, закончыў фізмат, толькі Брэсцкага педінстытута, але кандыдацкую дысертацыю абараніў па філасофіі, і яго абагульненыя разважанні пра адукацыю, палітыку, увогуле пра жыццё былі вельмі цікавыя. Да гэтага трэба дадаць, што рэктар Сцепановіч быў адкрытым, жыццялюбівым чалавекам, з добрым пачуццём гумару. Мікалай Міронавіч, як наш начальнік і спакушаны сталічны жыхар, любіў над намі абодвума пажартаваць, але, нягледзячы на гэта, нам утрох было камфортна.

Змяніў прафесара на пасадзе рэктара фізік-тэарэтык, доктар навук, прафесар Уладзімір Анесцієвіч Плецюхоў — мне не давялося з ім пазнаёміцца бліжэй, таму што ён нядоўга быў рэктарам, а я толькі пачынаў асвойваць гэтую пасаду. Але мы сустракаліся і гутарылі. Спакойны, удумлівы чалавек, мне тады здавалася, што яго думкі болей у тэарэтычнай фізіцы, чым у няпростых універсітэцкіх буднях.

З рэктарам Мечыславам Эдвардавічам Часноўскім мне ўжо давялося працаваць доўга і фундаментальна. Наша супрацоўніцтва паступова і неўпрыкмет перарасло ў сяброўства. Угаварыў яго паехаць у Брэст і ўзначаліць універсітэт у 2002 годзе міністр адукацыі П. І. Брыгадзін. Мечыслаў Эдвардавіч закончыў гістарычны факультэт БДУ, і ў гэтым жа ўніверсітэце прайшло яго станаўленне як вучонага і кіраўніка. Ён абараніў кандыдацкую, а пасля і доктарскую дысертацыю, выкладаў, быў намеснікам дэкана факультэта міжнародных адносін, пасля чаго пайшоў на дыпламатычную працу — часовым паверaным у справах Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча. Як Пётр Іванавіч змог пераканаць мінчаніна Часноўскага паехаць у Брэст і ўзначаліць там універсітэт, я не ведаю. На маё прамое пытанне з гэтай нагоды яны ўдвух толькі ўсміхаліся. Можа быць, адным з фактараў была блізкасць да польскай граніцы? Гэта, дарэчы, стварала немалыя праблемы для ўніверсітэта — яго выкладчыкі былі вельмі запатрабаваны ў польскіх універсітэтах, і іх пастаянныя і даволі працяглыя ваяжы за мяжу не спрыялі дысцыпліне і якасці вучэбнага працэсу.

Рэктар Чэсноўскі ўзначаліў няпросты прафесарска-выкладчыцкі калектыў, з невядомымі яму традыцыямі, з кланамі, якія склаліся да яго, няпростымі асабістымі адносінамі. Там нават была пярвічная арганізацыя так званых незалежных прафсаюзаў, якая дапякала сваёй настырнасцю і неўтаймаванасцю не толькі Мечыславу Эдвардавічу, але і абласному начальству. Але ён упісаўся ў калектыў, здолеў скіраваць яго на прадукцыйную працу, аздаравіць атмасферу асабістых адносін. Дыпламат!

Да мяне ў міністэрства ён прыязджаў рэгулярна, але не радзей чым адзін раз на квартал. Заўсёды з лістом паперы, на якім былі яго рукой запісаны (не надрукаваны!) сем пытанняў да мяне. Заўсёды сем! І цярплівa, але настойліва ён пачынаў дамагацца ад мяне вырашэння кожнага з іх. З пасады міністра я перайшоў на працу ў Адміністрацыю Прэзідэнта, але і туды рэктар Часноўскі працягваў прыязджаць усё гэтаксама рэгулярна і з такім самым спісам пытанняў. Яны былі розныя: грошы на будоўлю ці рамонт, адкрыццё новых спецыяльнасцяў, кадравыя пытанні, узнагароды і заахвочванні, усё той самы галаўны боль ад свабодных прафсаюзаў, удзел універсітэта ў палітычных кампаніях, цікавасць да калег па рэктарскім корпусе, чым азадачана на дадзены момант міністэрства... З гэтай нагоды я нават ушчуваў свайго пераемніка на рэктарскай пасадзе ў Магілёўскім універсітэце Канстанціна Міхайлавіча Бандарэнку:

— Часноўскі рэгулярна прыязджае да мяне з Брэста нешта выбіваць для свайго ўніверсітэта. У яго заўсёды сем пытанняў. Усе, канешне ж, адразу не вырашыць. Але хаця б адно з гэтага спіса я вырашаю! А цябе гадамі ў міністэрстве не відаць! У цябе такое лобі! Ужо ж для свайго ўніверсітэта я пастараюся не меней, чым для Брэсцкага. А ты гэтым не хочаш скарыстацца.

Я наведваў брэсцкі ўніверсітэт даволі рэгулярна. Ведаў там многіх выкладчыкаў, з задавальненнем выступаў і перад імі, і перад студэнтамі, увогуле адчуваў сябе ў гэтым калектыве добра. Але рэктар і тут выкарыстоўваў сітуацыю для вырашэння актуальных для ўніверсітэта праблем. Напрыклад, пры нашых пераездах па горадзе мы заўсёды аказваліся каля студэнцкага інтэрната, і Мечыслаў Эдвардавіч пачынаў мне «зудзець», што па плане тут павінны былі пабудаваць два прылеглыя адзін да аднаго дзевяціпавярховыя карпусы, а мы пабудавалі адзін. Прылеглая сцяна не ўцеплена, таму ўвесь інтэрнат халодны, зімою студэнты зусім замярзаюць. Трэба тэрмінова будаваць другі корпус, але на гэта патрэбны грошы. Спрабую сітуацыю спрасціць:

— Дык, можа быць, і хутчэй, і танней уцяпліць гэтую стыковачную сцяну?

— Не! Месца ў інтэрнаце для студэнтаў катастрафічна не хапае. Трэба рэалізоўваць задуманы будаўнічы праект у поўным аб'ёме!

І мы яго рэалізавалі!

**Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*(Працяг будзе 8 кастрычніка.)*

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая; 11 чэрвеня; 9, 16, 23, 30 ліпеня; 13, 20, 27 жніўня; 3, 17, 24 верасня.)*

# Мабільны навігатар па ВНУ

**«Белтэлекам» і Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт запусцілі лічбавую платформу «Мой універсітэт». Новы праект забяспечыць інтэрактыўнае ўзаемадзеянне і практычна імгненны доступ да паслуг і анлайн-сэрвісаў вышэйшай навучальнай установы.**

Па словах **генеральнага дырэктара РУП «Белтэлекам» Юрыя ПЕТРУЧЭНІ**, лічбавая платформа дасць магчымасць яшчэ больш эфектыўна вырашаць усе задачы, якія стаяць перад сучаснай адукацыяй, і стане выдатным памочнікам для абітурыентаў, студэнтаў і выкладчыкаў.

— «Мой універсітэт» — яшчэ адзін важны крок на шляху да трансфармацыі адукацыйнага працэсу ў рамках рэалізацыі канцэпцыі «Лічбавы ўніверсітэт 3.0», — падкрэслівае **рэктар Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Наталля ЛАПЦЕВА**. — Дадатак бачыцца як адзіная экасістэма, якая аб'ядноўвае электронныя сэрвісы, што функцыянуюць ва ўніверсітэце. Спадзяюся, што сумесна з РУП «Белтэлекам» мы зможам рэалізаваць усе задуманыя ідэі.

Прататыпам дадатку «Мой універсітэт» стала платформа «Мой горад», якая алічбавала асноўныя гарадскія сэрвісы і паспяхова працуе ўжо ў дзесяці гарадах Беларусі. Ствараючы дадатак для ВНУ, распрацоўшчыкі пашырылі яго функцыянал, сфакусіраваліся на патрэбах абітурыентаў, студэнтаў і работнікаў універсітэта. У ім рэалізаваны тыпавыя модулі: «інфармацыя», «навіны», «анлайн-запіс», «чат», «апытанне» і інш. З дапамогай мабільнага дадатку абітурыенты змогуць знаёміцца з інфармацыяй аб ВНУ і сачыць за ходам уступнай кампаніі, студэнты — вывучаць расклад, аператыўна атрымліваць апавяшчэнні аб зменах у раскладзе заняткаў, адпраўляць запыты ў дэканат. Для выкладчыкаў рэалізавана магчымасць аператыўнай камунікацыі са студэнтамі. Зараз у распрацоўцы — «разумны расклад» і інтэрактыўная карта ўніверсітэта. Дарэчы, функцыянал дадатку не абмежаваны і будзе пашырацца з улікам пажаданняў карыстальнікаў.

Цікавасць да новага праекта ўжо праяўляюць і іншыя ВНУ. Дадатак «Мой універсітэт» пакладзе пачатак развіццю лічбавых камунікацый у сферы адукацыі і стане свайго роду навігатарам па канкрэтнай установе адукацыі. Пры гэтым адметнасць сістэмы — просты, зразумелы інтэрфейс і гнуткі функцыянал. Дадатак «Мой універсітэт» даступны для запампоўвання на Android і iOS.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Руслан ЧАРНЕЦКІ:

# «Галоўнае — не быць абыякавымі да сваёй Радзімы, да нашай гісторыі»



**ЁН з тых шчаслівых людзей, каму пашанцавала знайсці любімую прафесію, сустрэць каханне і пражыць ужо сотні цікавых гісторый разам са сваімі персанажамі на тэатральнай сцэне і на кінаэкране. Лёс гэта ці здаровыя амбіцыі сапраўднага мужчыны, а можа, проста ўдалы збег абставін у жыцці канкрэтнага чалавека — тут могуць быць варыянты. Аднак пасля размовы з акцёрам тэатра і кіно, заслужаным артыстам Беларусі Русланам ЧАРНЕЦКІМ пераканалася — гэта вынік канкрэтных дзеянняў. Калі спрабуеш ісці за голасам сэрца, не баішся выпрабаванняў, але разумееш, як важна быць самім сабой, не згубіць арыенціраў.**

***— Ведаю, што ваша скарбонка прафесійных узнагарод папоўнілася званнем «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь». Ці паўплывала гэта на ваша самаадчуванне ў прафесіі?***

— Адказнасці стала больш, таму што званне вылучае сярод іншых. Больш увагі ад калег, кіраўніцтва, вядома, гледачоў. Бо калі людзі бачаць слова «заслужаны», то пачынаюць разважаць: а за што ён такога звання быў удастоены, пачынаюць больш пільна за артыстам назіраць. І ты ў сваю чаргу павінен гэтаму адпавядаць. А ў астатнім я такі ж, як і быў. Можа, яшчэ проста не ў поўнай меры адчуваю наступствы таго, што адбылося.

***— Многія вас павіншавалі? І ці няма адчування, што з узростам і ў сувязі з рознымі падзеямі па-сапраўднаму вашых людзей становіцца ўсё менш?***

— Я атрымаў шмат віншаванняў, бо ў сілу шматпланавасці таго, дзе рэалізоўваю сябе прафесійна, маю зносіны з вялікай колькасцю людзей. А што датычыцца другога пытання, то ёсць адчуванне, што кола майго атачэння не звужаецца, а па-новаму фарміруецца. Яно абнаўляецца. Некаторыя сыходзяць, а іншыя, наадварот, аказваюцца побач.

***— А калі крыху адматаць час, то што вам, маладому творчаму чалавеку, які шукае сябе, даў перыяд вучобы на аўтаслесара і служба ў арміі?***

— Я па жыцці фаталіст у пэўнай ступені. І разумею: калі нешта адбываецца, то не проста так. І спрацоўвае гэта заўсёды ў плюс. Таму што ў вучылішчы я змог займацца ўсім: і атрымліваць прафесію, і знаходзіць час для спорту і творчасці.

***— А як вашы бацькі паставіліся да рашэння сына ўсё ж звязаць жыццё з акцёрствам?***

— Важна ўлічваць, што маці з бацькам заўсёды падтрымлівалі мяне ва ўсім, што б я ні рабіў. Яны ніколі не забаранялі мне займацца тым, што мне падабалася. Давяралі мне ў гэтым сэнсе. Таму падтрымлівалі і маю цікавасць да акцёрства, калі я ў трэцім класе пачаў займацца ў ДК «Юнацтва». Праўда, тады сястра выказалася, маўляў, што гэта за прафесія для хлопца? І я задумаўся, а можа, і праўда не варта. А яшчэ ленаваўся ролі ад рукі перапісваць, бо не любіў пісаць. А калі ўжо прыйшоў да выбару акцёрскага шляху ўсвядомлена, то мне было 24 гады. Паступіў у Акадэмію мастацтваў, пачаў працаваць у тэатры. Думаю, калі б і пасля школы я вырашыў паступіць на акцёра, то мяне ніхто б не адгаворваў. А так дарослы хлопец, мама мой выбар прыняла (бацькі ўжо не было). І зноў жа, я хіба толькі інтуітыўна здагадваўся тады, што гэта маё на ўсё жыццё.

***— Атрымліваючы званне заслужанага артыста, вы адзначылі ў сваёй прамове, што вялікая роля ў гэтым належыць вашай сям'і. Скажыце, а як паўплываў ваш шлюб з Анастасіяй і нараджэнне дачкі Арыны?***

— Калі мы з Насцяй пазнаёміліся, доўга былі проста сябрамі. І да сёння мая жонка — мой самы лепшы сябар. Ёй я магу давяраць абсалютна ўсё. І дакладна ведаю, што гэты чалавек нават памрэ за мяне, калі тое спатрэбіцца, як і я за яе. Насця ва ўсім мяне падтрымлівае, як бы страшна ёй ні было. Зноў жа, вярнуўшыся да падзей двухгадовай даўнасці, калі праходзіў жаночы форум, я помню, як яна перажывала за мяне... Але, нягледзячы ні на што, яна заўсёды была на маім баку, таму што бачыла мой спакой і разумела, што так правільна.

***— Вы сапраўды адчувалі спакой ці толькі не праяўлялі эмоцый?***

— Перш за ўсё я быў упэўнены ў кіраўніцтве краіны і ў людзях, якія нас абараняюць. Плюс быў перакананы, што праўда на нашым баку. Бо ў мяне адно з хобі — гэта геапалітыка і глабальная эканоміка. Мне проста ў нейкі момант стала цікава, як усё гэта працуе і што характэрна зараз гэтым працэсам. Я пачаў слухаць эканамістаў, а пасля і палітолагаў, ды і сам нешта ведаў ужо на той момант. І цяпер я таксама працягваю вывучаць гэтыя тэмы, адсочваць падзеі...

Мая жонка пра ўсё гэта ведае і давярае мне, заўсёды — за мяне гарой. Думаю, так і павінна паводзіць сябе кожная жонка, каб яе мужу было лягчэй займацца тым, чым ён займаецца. Каханая жанчына нібы стварае абярэг для свайго мужчыны. Толькі тады ўсё будзе ў яго атрымлівацца. Таму большая частка маіх дасягненняў — дзякуючы ёй.



Фота Лізаветы ГОЛАД.

**У прэм'ерным спектаклі «Месяц у вёсцы» Руслан іграе Аркадзя Іслаева.**

***— А што хочацца даць дачцэ, пакуль яна спазнае свет побач з вамі?***

— Мне вельмі хочацца, каб яна вырасла і не перастала любіць людзей. Таму што зараз гэта не так проста. Нас жа доўгі час пераконвалі, што трэба жыць толькі для сябе. І шмат іншых заходніх «каштоўнасцяў» трансліравалі, але, дзякаваць богу, не ў поўным аб'ёме тое да нас даходзіла ў параўнанні з той жа Украінай. Нас крыху абмежавалі ад усяго гэтага, захаваўшы ў грамадстве сапраўдныя чалавечыя каштоўнасці, а не тое, што некаму выгадна... І мне важна даць Арыне разуменне тых законаў, на якіх трымаецца свет, якія дазваляюць ствараць і захоўваць сапраўднае. Хочацца, каб мая дачка вырасла годным чалавекам. Не так важна, кім яна стане ў жыцці, галоўнае — каб была шчаслівай. Дасягнуць гэтага не проста, тым больш у наш час, калі навокал столькі спакус для дзяцей. Ёй яшчэ складана, напрыклад, зразумець, чаму яе «хачу» не настолькі важнае, як «трэба». Але я стараюся даносіць да яе разуменне важных рэчаў і бачу, што мае намаганні даюць парасткі.

***— Калі прааналізаваць розныя падзеі, тэндэнцыі сучаснага жыцця, то што вам блізка, а што засмучае і непакоіць?***

— Занепакоенасць выклікае тое, што не ўсе ўсведамляюць, у які няпросты час мы жывём. Апошні раз такія перамены, якія назіраем сёння, адбываліся паўтысячагоддзя таму, калі феадалізм змяняўся капіталізмам. Зараз таксама змяняюцца правілы гульні як у палітычным, так і ў эканамічным сэнсе, таму выстаіць той, хто здолее перастроіцца і прызвычаіцца да новай рэальнасці. Трэба працаваць, прычым не на сябе, а на грамадства, бо толькі разам мы здолеем перажыць цяжкія часы.

***— Пераглядаючы раннія фільмы з вашым удзелам, я ў «Кадэце» пачула фразу, сугучную сённяшняму дню: «Гісторыю сваёй Радзімы трэба ведаць, помніць і ўмець абараняць». Што пад сілу кожнаму з нас, каб захаваць тое, што маем, і перадаць наступным пакаленням?***

— Галоўнае — не быць абыякавымі да сваёй Радзімы, да нашай гісторыі. Трэба імкнуцца ўнікаць у тое, што адбываецца. Важна ведаць, што было раней, каб зноў не паўтарыць тых жа памылак. Выпрабаванняў нашай краіне за яе гісторыю выпала нямала. І ў нашых сілах цяпер устаць і сказаць: «Тут вам не прахадны двор! Мы маем свае інтарэсы. І як мы не ўмешваемся ў вашы справы, так і вы не лезьце да нас!» І трэба разумець, што заўсёды будуць тыя, каму такая пазіцыя недаспадобы. Нам Захад дзесяцігоддзямі імкнецца навязваць мадэль паводзін, каштоўнасці і стандарты прыгажосці, але толькі ад нас залежыць, ці дасягне ён у гэтым поспеху.

***— Калі вярнуцца да прафесіі, то зразумела, што праца ў тэатры і ў кіно — гэта розныя гісторыі. Як вам удаецца ўсюды паспяваць і не страчваць запалу?***

— Часам даводзіцца нечым ахвяраваць і ад нейкіх прапаноў адмаўляцца. А ў астатніх выпадках усё неяк складваецца, бо важна, каб было жаданне сумяшчаць, тады ўсё атрымаецца. Але пры любым раскладзе ты заўсёды павінен быць гатовы да здымак, да рэпетыцыі. Калі трэба, то не даспі пару гадзін, але вывучы тэкст, папрацуй над роллю. Альбо перагледзі свой графік, прыярытэты, каб знайсці час і месца для сапраўды важных рэчаў, каб паспець усюды. Я ў прынцыпе трывучы чалавек, і прафесія дае мне сілы, бо займаюся тым, што мне даспадобы. А калі ўзнікае патрэба перазагрузіць галаву, то едзем з сям'ёй у вёску. Дзень-другі кашу, іду на рыбалку, і ўсё — зноў гатовы вяртацца да працы ў звыклым тэмпе.

***— А шмат часу вам патрабуецца, каб знайсці кропкі судакранання з героем, якога ўвасабляеце на сцэне ці на экране?***

— Тут заўсёды па-рознаму складваецца. Вось у «Гур'янаве» давялося памучыцца, бо там герой — чалавек святы, а я зусім не такі. І каб дасягнуць гэтага на сцэне, давялося проста вывернуць усяго сябе. Таму бывае, што на раз-два знаходзіш, ад чаго адштурхнуцца, а часам месяцамі не знаходзіш кропак судакранання. У тых жа спектаклях «Браты Карамазавы», «Граф Монтэ-Крыста» ўсё добра склалася. А вось зараз паказваем «Месяц у вёсцы», і там роля меншая, але працаваць над ёй складаней.

**Алена ДРАПКО.**

**Руслана Чарнецкага.**

*Поўны тэкст інтэрв'ю на сайце zviazda.by*

Тым часам

# ВЯСКОВЫ МЕСЯЦ ЖАРСЦЯЎ І СУМНЕННЯЎ

## Тэатр імя Горкага распачаў юбілейны сезон

**Сёлета ў Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Горкага пачаўся 90-ы, юбілейны, сезон. З гэтай нагоды запланавана ажно чатыры прэм'еры, першая з якіх адбылася 24 верасня. «Звязда» завітала на здачу спектакля «Месяц у вёсцы», рэжысёрам-пастаноўшчыкам якога стала народная артыстка Беларусі Вольга КЛЕБАНОВІЧ.**

Лірычная камедыя створана па матывах аднайменнай п'есы Івана Тургенева. Падзеі разгортваюцца ў вясковым маёнтку Іслаева. Павольны і звыклы ўклад жыцця парушае прыезд настаўніка Аляксея Бяляева ў выкананні Кірыла Нікіціна. На працягу некалькіх дзён сям'я перажывае шмат падзей, у выніку якіх перад галоўнымі героямі паўстае пытанне: ці сапраўды яны блізкія людзі, альбо гэта толькі ілюзія?

Вольга Клебановіч прыўносіць свой аўтарскі погляд у трактоўку п'есы. Так, самы складаны шлях даводзіцца прайсці Лізавеце Багданаўне, жонцы Іслаева. У выкананні Іны Савянковай галоўная гераіня ўвесь час павінна весці барацьбу з самой сабой. Як можа жанчына высокага саслоўя закахацца ў дваццацігадовага настаўніка? Але яна не адзіная, хто падпадае пад уплыў Бяляева. Яе выхаванка, сірата Верачка, таксама закахалася ў Бяляева. Ролю сямнаццацігадовай дзяўчынкі выконвае Дар'я Палякова.

Канфлікт паміж гераінямі разгортваецца паступова, спачатку незаўважна, але з кожнай сцэнай набірае моц. Здаецца, адзіны, хто захоўвае халодны розум, — гэта Ракіцін, блізкі сябар сям'і Іслаевых. Ролю разважлівага інтэлігента выканаў заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Сяргей Чэкерэс.

Пасля маналогу аб сапраўднай вартасці сям'і, у якой адсутнічае паразуменне, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Руслан Чарнецкі ўдастойваецца апладысментаў ад гледачоў. У яго выкананні Аркадзь Іслаеў таксама праходзіць нечаканую трансфармацыю. Ствараючы вобраз безуважлівага чалавека, які ўвесь час лунае ў аблоках, Чарнецкі напрыканцы спектакля адкрывае гледачам другі бок Іслаева — мужа, які кахае сваю жонку і гатовы зрабіць усё, каб яна была шчаслівая. Нават калі для гэтага трэба яе адпусціць.

Пастаральная ідылія, у якой існуюць героі, адлюстроўваецца дзякуючы рабоце стваральнікаў пастаноўкі. Спектакль насычаны светлымі колерамі і адценнямі, прыроднымі гукамі — спевамі птушак і шумам дрэў. За сцэнаграфію «Месяца ў вёсцы» адказвала Аляксандра Карнажыцкая, а за касцюмы — Таццяна Лісавенка. Наступны паказ спектакля адбудзецца 21 кастрычніка.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# ФІЛАСОФІЯ ПАЭТАЎ КІТАЯ І САКРЭТ ШЧАСЛІВАЙ СЯМ'І АД КОЛАСА



**На гэтым тыдні Выдавецкі дом «Звязда» правёў адразу дзве кніжныя прэзентацыі. Розныя пісьменнікі ды эпохі, але ёсць адна рыса, якая аб'ядноўвае гэтыя мерапрыемствы, — павага да літаратурных здабыткаў. Актыўная праца дае свой плён: падчас прэзентацый свабодных месцаў не было. Гэта сведчыць аб тым, што зацікаўлены чытач існуе як сярод моладзі, так і сярод людзей старэйшага пакалення. У гэтым матэрыяле «Звязда» падзеліцца з вамі ўспамінамі з літаратурных імпрэз, а таксама распавядзе аб кніжных навінках выдавецтва.**

## ВОБРАЗНАЕ ЛЮСТЭРКА ТЫСЯЧАГОДДЗЯЎ

У Літаратурным музеі Максіма Багдановіча 28 верасня адбылася імпрэза «Светлыя знакі: паэты Кітая». Мерапрыемства, зладжанае пры падтрымцы Саюза пісьменнікаў Беларусі і Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, сабрала пісьменнікаў, перакладчыкаў, аматараў паэзіі і студэнтаў філалагічнага факультэта. Удзельнікі падзяліліся досведам перакладу кітайскіх вершаў на беларускую мову, а таксама распавялі аб шляху, які ім давялося прайсці, каб айчынны чытач не толькі дакрануўся, але і зразумеў паэтычныя здабыткі Усходу. Таксама госці імпрэзы даведаліся, як гучыць Янка Купала па-кітайску і калі Максім Багдановіч падымаўся на Вялікую Кітайскую сцяну.

Адным з гасцей сустрэчы стаў **загадчык аддзела Пасольства КНР у Рэспубліцы Беларусь па справах культуры Чжан ХУНВЭЙ**. Ён адзначыў, што культура спрыяе ўмацаванню дружбы паміж народамі:

— Знаёмства з замежнай літаратурай — гэта магчымасць пашырыць гарызонты ўласнай, а таксама лепш даведацца пра людзей, якія жывуць на геаграфічнай аддаленасці. Сёння я таксама сустрэўся са сваімі сябрамі з выдавецкага кола, гэта прадстаўнікі Выдавецкага дома «Звязда» і выдавецтва «Мастацкая літаратура». Наша супрацоўніцтва паспяховае і плённае. Трэба адзначыць, што зносіны паміж Кітаем і Беларуссю дасягнулі новага ўзроўню, мы будзем працягваць уносіць пазітыўны ўклад у справу рэалізацыі канцэпцыі «Адзін пояс, адзін шлях».

— Серыя «Светлыя знакі: паэты Кітая» — гэта праект калегіяльнай працы. На імпрэзу мы запрасілі многіх аўтараў гэтага праекта, — адзначыў **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ**. — Па-першае, тут прысутнічаюць паэты, якія працавалі над перакладамі: Тацццяна Сівец, Навум Гальпяровіч, Рагнед Малахоўскі, Віктар Шніп. Гэты праект не адбыўся б, калі б не падтрымка факультэта міжнародных адносін БДУ. Дзякуючы яго выкладчыцы Алене Раманоўскай, мы пачалі рабіць кнігі серыі двухмоўнымі, па-беларуску і па-кітайску. Я вельмі ўдзячны філалагічнаму факультэту, адтуль да нас прыйшоў невялікі, але моцны атрад перакладчыкаў. Сам праект пачаўся ў снежні 2014 года. Да нас у Беларусь прыехала вялікая група кітайскіх чыноўнікаў, яны прапанавалі заключыць пагадненне і стварыць праграму ўзаемнага перакладу і кнігавыдання. У лютым 2015 года Кітай стаў ганаровым госцем Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Да гэтага часу мы ў Выдавецкім доме «Звязда» выдалі чатыры кнігі ў серыі «Светлыя знакі: паэты Кітая». Пасля ўзялі сабе за правіла рабіць хаця б па тры кнігі штогод. Спачатку гэтым займалася наша выдавецтва, потым «Мастацкая літаратура», за што я вельмі ўдзячны калектыву.

**Намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» — галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Віктар ШНІП** адзначыў, што паэзія здольная аб'яднаць людзей з розных куточкаў планеты:

— Выдавецтва «Мастацкая літаратура» з прыемнасцю ўзяло эстафету серыі «Светлыя знакі: паэты Кітая». Зразумела, перакладаць творы з кітайскай мовы даволі складана. Калі пачаць рыфмаваць, нешта губляецца. У Кітаі не так шмат рыфмаваных вершаў. Памятаючы аб гэтым, асабіста я імкнуўся перакладаць так, каб не згубіць філасофскую глыбіню арыгінала.

Падчас імпрэзы выступілі кітайскія студэнты, якія вывучаюць беларускую мову. Яны прачыталі ўрывак з паэмы «Курган» Янкі Купалы на беларускай і кітайскай мове. Перакласці класіка айчыннай літаратуры дапамагла выкладчыца і перакладчыца Дар'я Нечыпарук.

## ПАДРУЧНІК ПА СЯМЕЙНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ

На наступны дзень Выдавецкі дом «Звязда» прэзентаваў кнігу «Табой я жыў, табой жыву...», прысвечаную Марыі Дзмітрыеўне Міцкевіч, жонцы Якуба Коласа. Сустрэча з укладальнікамі кнігі і сваякамі класіка адбылася ў Дзяржаўным літаратурным музеі Якуба Коласа. Госці прэзентацыі даведаліся аб цікавостках, якімі насычана кніга, а таксама ўбачылі фрагменты відэазапісу, дзе сын Даніла распавядаў аб сваёй маці.

У выданне ўвайшлі лісты Якуба Коласа да Марыі Дзмітрыеўны, арыгінальныя творы і фотаздымкі. Да гэтага часу не было асобнага выдання, прысвечанага менавіта Марыі Дзмітрыеўне. Падчас прэзентацыі адна з укладальніц кнігі, унучка Якуба Коласа і **даследчыца ягонай творчасці Вера МІЦКЕВІЧ** распавяла:

— Мы заняліся гэтай работай вясной 2020 года. Шмат інфармацыі знайшлося ў сямейных архівах. Другі раздзел кнігі, найбольш шчымлівы, прысвечаны ліставанню. Апошні ліст, які Якуб Колас напісаў Марыі Дзмітрыеўне, датуецца 9 мая 1945 года. У той час стан жонкі класіка быў вельмі дрэнны — яна сыходзіла з жыцця. Адказаць на ліст у яе не было сіл... Таксама мне давялося скласці багаты біяграфічны даведнік.

Фотаздымкамі, ілюстрацыямі, артыкуламі Міхася Канстанцінавіча і прысвячэннямі займалася другая ўкладальніца кнігі, **галоўны захавальнік фондаў музея Якуба Коласа, праўнучка класіка Васіліна МІЦКЕВІЧ**:

— Для нас вельмі важна, што ў юбілейны год, калі ў Беларусі адзначаецца 140-годдзе з дня нараджэння Якуба Коласа, гэта кніга пабачыла свет. Я ўпэўнена, што выданне прынясе сапраўдную асалоду душы. Я яшчэ раз хачу падзякаваць Выдавецкаму дому «Звязда» за шыкоўнае афармленне. Адначу, што праца над кнігай ішла доўга. Для Якуба Коласа Марыя Дзмітрыеўна была не толькі любай жанчынай, не толькі музай, але і маці ягоных дзяцей, ахоўніцай сямейнага агмення, першым чытачом, крытыкам. Гэта жанчына, якая заўсёды ішла поруч з паэтам, дапамагала яму ў цяжкіх жыццёвых абставінах. Невыпадкова кажуць, што за кожным таленавітым мужчынам стаіць не менш таленавітая і разумная жанчына. У сваёй эпісталярнай спадчыне паэт адзначаў, што такая жанчына, як Марыя Дзмітрыеўна, трапляецца адна на дзесяць тысяч.

У Выдавецкага дома «Звязда» ўжо склаўся пэўны кірунак працы — некалькі гадоў таму была выдадзена кніга, прысвечаная сярэдняму сыну Якуба Коласа Юрку.

Дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Ірына Мацяс паведаміла, што наступная прэзентацыя выдання «Табой я жыў, табой жыву...» адбудзецца 13 кастрычніка ў Цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы імя Астроўскага.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Прэм'ера

# ШОСТАЕ ПАЧУЦЦЁ Ў ВЕРСІІ № 6,
## альбо Каго не зацягваюць у нябыт?



**ЯКАЯ крохкая была дзяўчынка... Жорсткі падман перажыць не здолела. Каханы аказаўся не тым чалавекам, для яго гэта была ўсяго толькі гульня, якая абярнулася трагедыяй. Але смерць — гэта пачатак іншага жыцця не толькі для яе, бо, усвядоміўшы віну, ён не зможа проста так хадзіць па зямлі... Гісторыя, якіх безліч. Нездарма кажуць, што ў мастацтве даўно адлюстравана ўсё і нават больш. Таму што ў балеце «Жызэль» зямное жыццё перакрыжоўваецца з тонкім светам нябачных зданяў: душы віліс (дзяўчын, якія памерлі нявестамі) і на гэтым свеце пераследуюць тых, хто пакрыўдзіў пяшчотнае сэрца. Але калі хто скажа, што так не бывае, то толькі таму, што не глядзеў «Жызэль» Адольфа Адана.**

Салісты Людміла Хітрова і Эвэн Капітэн распавялі пра захапленне, радасць, горыч, страту розуму і жыцця і пакуты пакаяння настолькі драматычна, што стварылі нейкую містыку на сцэне. Хоць яна і была першапачаткова закладзена аўтарамі балету — найперш праз шматлікія сімвалы і метафары, зашыфраваныя ў дзеі, але праз выканаўцаў галоўных партый нешта ледзь улоўнае мог адчуць нават той, хто на балет прыйшоў упершыню і не ведае, у чым асаблівасць і рамантызм «Жызэлі». А гэта кранальная і тонкая гісторыя дзвюх душ, паміж якімі існуе сувязь нават тады, калі яны ўжо належаць розным светам — кожнай неабходна перараджэнне. Адной — праз дараванне, другой — праз пакаянне. Гэта мала толькі станцаваць. Трэба стаць носьбітам містыкі, якую нясе ў сабе мастацтва. І тады ў фінале застаецца галоўнае: цуд, які ўдалося стварыць артыстам. Здавалася, што яны таксама перарадзіліся праз тое самае шостае пачуццё, якое дазваляе перадаваць няўлоўнае...

Гэта спектакль, які павінен быць у кожным тэатры. Ён і быў у рэпертуары Вялікага тэатра Беларусі з 1953 года, перыядычна абнаўляючыся. Папярэдняя пастаноўка была ажыццёўлена дзесяць гадоў таму. І вось Ігар Колб, які напрыканцы мінулага сезона стаў галоўным балетмайстрам тэатра, прадставіў шостую версію «Жызэлі» ў Беларусі.

Класічная харэаграфія — па ўзоры славутага Марыінскага тэатра ў Санкт-Пецярбургу, дзе Ігар Колб яшчэ нядаўна выходзіў на сцэну ў партыях Альберта і Ганса. Тут рухі, якія ён памятае і адчувае целам. На гэта і быў разлік — зрабіць перанос спектакля, які прайшоў праз час з XIX стагоддзя ад харэографаў Жана Каралі і Марыуса Пеціпа. Але ж нават у класічнай версіі пастаноўшчык можа знайсці шляхі для самавыяўлення. У дадзеным выпадку гаворка хутчэй пра сцежкі. А яны хоць і прыхаваныя, але ідуць у некалькіх кірунках, што дазволіла зрабіць палатно спектакля больш складаным.

Па-першае, быў знойдзены музычны фрагмент, які не выкарыстоўваўся раней. Але з дапамогай кампазітара Вячаслава Кузняцова, які зрабіў партытуру, фрагмент увайшоў у музыку Адана, і ў выніку першы акт узбагаціла па-дэ-дэ сялянскага вяселля. Так, можна было і без яго. Але наша разуменне трагедыі Жызэлі ўдакладняецца: пабачыўшы чужое шчасце, яна больш востра адчуе сваё няшчасце. Бо гледачу трэба паверыць: дзяўчаты сапраўды могуць памерці з-за кахання... Дырыжор Мікалай Калядка прапанаваў лічыць сусветнай прэм'ерай выкананне гэтага фрагменту.



Фота БелТА.

Па-другое, першы акт прысвечаны жыццю і максімальна насычаны жывой энергіяй. Яе выпраменьваюць героі, якія не ўпісаны ў лібрэта. Сялянскае вяселле выязджае на сцэну на поні з вазком. Шляхетнае паляванне суправаджаюць дзве ганчыя. Так, гледачы ў захапленні. Але сутнасць не толькі ў самім факце, колькі ў акцэнце на жывой прыродзе гэтага свету. Каб больш выразным было адчуванне іншага свету — памерлых дзяўчат. І калі вясёлыя дзяўчаты падзяляюць пару Жызэлі і Альберта танцам, выбудаваным у форме крыжа, разумееш, што лёс скажа сваё слова ў другім акце.

Тут пануюць віліс на чале з Міртай, якая нібыта паўстае з магілы. І па-трэцяе, нерэальны (на нашу думку) свет дапамагаюць стварыць тэхнічныя знаходкі, якія тут выкарыстоўваюцца вельмі эфектна: дзяўчаты ў белым устаюць з-пад зямлі, пралятаюць над ёю. Паветра — іх стыхія. Таму паветраныя танцы балерын, якія нібыта лунаюць — ціха плывуць на пуантах, завісаюць у скачках. Так жа бязважка распраўляюцца з Гансам, які разбурыў прыгожую казку закаханай Жызэлі. Так жа чароўна — не паспрачаешся, што заслужана, — вырашаюць пакараць Альберта. І лёгка, амаль пакорліва адступаюць перад каханнем дзяўчыны, якая за яго просіць... Нездарма чароўная ноч, калі, згодна з паданнем, віліс выходзяць з цемры, грае водбліскамі святла — сімвала жыцця і зямнога, і вечнага.

Балет «Жызэль» паводле задумы аўтараў прасякнуты сімваламі (кветкі, крыжы, дарогі, званы), пра якія абавязкова захочацца даведацца больш, а потым паспрабаваць іх прыкмеціць і звязаць паміж сабой — тады карціны яднаюцца, і гісторыя двух сэрцаў успрымаецца больш выразна. Яна не казачная (да чаго могуць схіляюць дэкарацыі) — яна трагічная і велічная адначасова. Разумеючы гэта, пільна ўглядаешся ў тое, што робяць, як кантактуюць і танцуюць артысты. Бо нават мова танца тут трымаецца на метафарах. Само па сабе гэта прыгожа ў класічным варыянце, але ён патрабуе дасканаласці ад усіх, хто выходзіць на сцэну (а ў другім складзе чакае сустрэча з маладымі беларускімі артыстамі ў галоўных ролях ). Але якая Жызэль і які Альберт у нас ужо ёсць!..

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Автотрансстрой»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Кап. строение с инв. № 630/С-79467 (назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства; наименование – автозаправочный пункт, общая площадь – 8,9 кв. м) | 41 750,00 | 4 175,00 | 2 087,50 |
| 2 | Пылесос «ЗИЛ-900», инв. № 628 | 210,60 | 21,06 | 10,53 |
| 3 | Сверлильный станок 2Н 125, инв. № 680 | 1 296,00 | 129,60 | 64,80 |
| 4 | Огнетушитель ОУ-80, инв. № 707 | 313,20 | 31,32 | 15,66 |
| 5 | Огнетушитель ОУ-80, инв. № 708 | 313,20 | 31,32 | 15,66 |
| 6 | Станок 3Б-634 точильно-шлифовальный, инв. № 713 | 307,80 | 30,78 | 15,39 |
| 7 | Обдирочно-шлифовальный станок 3Б633, инв. № 715 | 210,60 | 21,06 | 10,53 |
| 8 | Сверлильный станок 2Н135, инв. № 718 | 1 404,00 | 140,40 | 70,20 |
| 9 | Станок хонинговальный 3Г833, инв. № 721 | 1 242,00 | 124,20 | 62,10 |
| 10 | Станок 2М112 настольно-сверлильный, инв. № 768 | 345,60 | 34,56 | 17,28 |
| 11 | Пневмомолот М41-32А, инв. № 750 | 2 160,00 | 216,00 | 108,00 |
| 12 | Сверлильный станок 2Н125, инв. № 751 | 1 296,00 | 129,60 | 64,80 |
| 13 | Сверлильный станок 2Н135, инв. № 760 | 1 404,00 | 140,40 | 70,20 |
| 14 | Станок 2М 122 настольно-сверлильный, инв. № 795 | 345,60 | 34,56 | 17,28 |
| 15 | Мерник образ. М2Р-50, инв. № 1026 | 226,80 | 22,68 | 11,34 |
| 16 | Компрессор У-43102А, инв. № 6071 | 540,00 | 54,00 | 27,00 |
| 17 | Полуприцеп КЕГЕЛЬ SN 24 74-24 АА-5, инв. № 19887 | 3 402,00 | 340,20 | 170,10 |
| 18 | Автомобиль МАЗ 5440А5-330-000 АК 0727-5, инв. № 10677 | 4 860,00 | 486,00 | 243,00 |
| 19 | Ноутбук Samsung NP-R70, инв. № 480001 | 37,80 | 3,78 | 1,89 |
| 20 | Верстак слесарный 23 шт. (инв. номер 637), инв. № 637-658 | 4 222,80 | 422,28 | 211,14 |
| 21 | Шкаф металлический 28 шт., инв. № 924-951 | 3 024,00 | 302,40 | 151,20 |
| 22 | Стол для руководителя, инв. № 7007 | 145,80 | 14,58 | 7,29 |
| 23 | Металлические стеллажи, согласно списку № 1: https://docs.google.com/document/d/10fWY96-jCQmPJ98wyn3JnlhH8ZNB-LOs/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 118,80 | 11,88 | 5,94 |
| 24 | Имущество, согласно списку № 2: https://docs.google.com/document/d/12RSNzANk4zPn9gMNobWpbiSaEVNDe9cK/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 591,69 | 59,17 | 29,58 |
| 25 | Имущество, согласно списку № 3: https://docs.google.com/document/d/1I3DDGZ38qGG4vGQnW-p4ylwmEbJeqb7t/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 253,35 | 25,34 | 12,67 |
| 26 | Имущество, согласно списку № 4: https://docs.google.com/document/d/1grRy4m3qcP7qxoLsPHO3qRMVBPV4iSx_/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 237,60 | 23,76 | 11,88 |
| 27 | Кабина МАЗ | 2 592,00 | 259,20 | 129,60 |
| 28 | Имущество, согласно списку № 5: https://docs.google.com/document/d/1HxadctxYycwzxTjXP_dBNU0ihvk7lXZ-/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 228,01 | 22,80 | 11,40 |
| 29 | Автомобиль ГАЗ-2705, АР 6310-5, г. в. 1999 | 1728,00 | 172,80 | 86,40 |
| 30 | Автомобиль МАЗ-551605-271, АК 0692-5, г. в. 2010 | 22 032,00 | 2 203,20 | 1 101,60 |
| 31 | Автомобиль Фольксваген Шаран, 1244 ВН-5, г. в. 1995 | 5 040,00 | 504,00 | 252,00 |
| 32 | Капитальное строение с инв. номером 630/С-49330 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание, общая площадь – 1 944,2 кв. м) | 700 560,00 | 70056,00 | 35028,00 |
| 33 | Полуприцеп бортовой тентованный Metaco 334 SD, А 90-77 А5, 1994 г. в., инв. № 19674 | 5 400,00 | 540,00 | 270,00 |
| 34 | Автомобиль МАЗ-551605-271, АМ 9751-5, 2013 г. в, инв. № 010171 | 29 592,00 | 2 959,20 | 1 479,60 |
| 35 | Автомобиль МАЗ-551605-271, АМ 9752-5, 2013 г. в., инв. № 010189 | 29 592,00 | 2 959,20 | 1 479,60 |
| 36 | Автомобиль МАЗ-551605-271, AI 7405-5, 2010 г. в., инв. № 12777 | 24 408,00 | 2 440,80 | 1 220,40 |
| 37 | Автомобиль МАЗ-551605-271, AI 7407-5, 2010 г. в., инв. № 12751 | 24 408,00 | 2 440,80 | 1 220,40 |
| 38 | Автомобиль МАЗ-551605-271, АК 0691-5, 2010 г. в., инв. № 10601 | 24 408,00 | 2 440,80 | 1 220,40 |
| 39 | Автомобиль МАЗ-551605-271, АМ 9753-5, 2013 г. в., инв. № 010197 | 29 592,00 | 2 959,20 | 1 479,60 |
| 40 | Горизонтально-фрезерный станок 6082, инв. № 759 | 3 564,00 | 356,40 | 178,20 |
| 41 | Горизонтально-шлифовальный станок 3722, инв. № 714 | 3 132,00 | 313,20 | 156,60 |
| 42 | Станок 3К-633, инв. № 1040 | 669,60 | 66,96 | 33,48 |
| 43 | Станок Р-105, инв. № 734 | 831,60 | 83,16 | 41,58 |
| 44 | Станок ЦКБ-Р335, инв. № 724 | 604,80 | 60,48 | 30,24 |
| 45 | Станция 0160-2, инв. № 1041 | 777,60 | 77,76 | 38,88 |
| 46 | Установка ЦКБ-Р-114, инв. № 719 | 1 404,00 | 140,40 | 70,20 |
| 47 | Прессножницы, инв. № 756 | 3 672,00 | 367,20 | 183,60 |
| 48 | Компрессор 2ВУ1-25/13 м4, инв. № 771 | 1 728,00 | 172,80 | 86,40 |
| 49 | Пылесос «ЗИЛ-900», инв. № 727 | 183,60 | 18,36 | 9,18 |
| 50 | Кран-балка 1 т, пролет 9 м, инв. № 6050 | 1 728,00 | 172,80 | 86,40 |
| 51 | Кран-балка 1 т, пролет 9 м, инв. № 6070 | 1 728,00 | 172,80 | 86,40 |
| 52 | Кран-балка 3,2 т, пролет 24 м, инв. № 601 | 7 452,00 | 745,20 | 372,60 |
| 53 | Кран-балка 3,2 т, пролет 24 м, инв. № 602 | 7 452,00 | 745,20 | 372,60 |
| 54 | Сварочный агрегат, инв. № 1082 | 313,20 | 31,32 | 15,66 |
| 55 | Сварочный агрегат, инв. № 1082а | 313,20 | 31,32 | 15,66 |
| 56 | Сварочный агрегат, инв. № 1082б | 313,20 | 31,32 | 15,66 |

В отношении лота № 1 проводятся шестые повторные торги. **Стоимость снижена на 75 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 86 (29708) от 05.05.2022, стр. 14, № 117 (29739) от 17.06.2022, стр. 14, № 130 (29752) от 06.07.2022, стр. 11, № 144 (29766) от 26.07.2022, стр. 6, № 160 (29782) от 17.08.2022, № 176 (29798) от 08.09.2022, стр. 6. В отношении лотов №№ 2–27 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость снижена на 55 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 117 (29739) от 17.06.2022, стр. 14, № 144 (29766) от 26.07.2022, стр. 6, № 160 (29782) от 17.08.2022, № 176 (29798) от 08.09.2022, стр. 6. В отношении лота № 28 проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 25 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 144 (29766) от 26.07.2022, № 176 (29798) от 08.09.2022, стр. 6. В отношении лотов №№ 29-32 проводятся третьи повторные торги. **Стоимость снижена на 40 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 138 (29760) от 16.07.2022, стр. 4, № 165 (29787) от 24.08.2022, № 176 (29798) от 08.09.2022, стр. 6. В отношении лотов №№ 33-56 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № № 165 (29787) от 24.08.2022, стр. 14

**Местонахождение лота № 1:** Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 2/5.
Лот № 1 и № 32 расположены на земельном участке с кадастровым номером 642000000003000030, площадью 4,4255 га, для обслуживания и эксплуатации производственной базы.
Право аренды Продавца (83/100 доли).
**Местонахождение лотов №№ 2–56:** Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 2

| | |
|---|---|
| **Ограничения (обременения)** | В отношении лота № 1: аренда открытой площадки с бетонным покрытием (является составным элементом автозаправочного пункта) для осуществления хозяйственной и иной деятельности до 14.11.2025.<br>В отношении лота № 36: аренда помещений: 82.6 кв. м, 7.7 кв. м, 20.4 кв. м (по 31.12.2022), 12.9 кв. м (по 28.01.2023), 156.47 кв. м (по 10.01.2027), 34.3 кв. м (по 31.12.2025), 19.4 кв. м, 102.9 кв. м (по 31.12.2025).<br>Земельный участок с кадастровым номером 642000000003000030 имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: код 5,1 – площадь 0,7390 га; код 5,2 – площадь 0,7390 га; код 5,5 – площадь 0,7390 га; код 5,7 – площадь 0,7390 га.<br>**По вопросу обременений обращаться по тел. +375293489225** |
| **Дата и время проведения торгов** | **18 октября 2022 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **с 10.00 3 октября 2022 года до 16.00 14 октября 2022 года** |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901, задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «Автотрансстрой», проводимых 18.10.2022.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр.лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – по Лоту №№ 1; 32 – 5 %, по Лотам №№ 2–31; 33–56 – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов **– Александр Николаевич, +375292627504. Дополнительная информация по лотам №№ 1, 35 по тел.: +375293042560, +375293082762.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Автотрансстрой» в лице ликвидатора – ООО «Центр антикризисных проектов», тел.: 80172552928; +375293489225 (Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, д. 2, УНП 600077182)** |
